РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 ЖНІЎНЯ 2025 г. СУБОТА № 162 (30550)

# У ФАРМАЦЕ ШЧЫРАЙ РАЗМОВЫ





## У размове з журналістамі Прэзідэнт расказаў, як робіцца вялікая палітыка

СТАР. 2–7

Учарашні дзень у Палацы Незалежнасці ўжо назвалі супермедыйным. Прэзідэнт даў фактычна два вялікія інтэрв'ю, хоць адно з іх можна назваць і паўнавартаснай прэс-канферэнцыяй. Спачатку Аляксандр Лукашэнка адказваў на пытанні прадстаўніка вядучай кітайскай медыякарпарацыі, што выглядае лагічным, улічваючы яго хуткі візіт у КНР, які беларускі лідар сам праанансаваў напярэдадні падчас нарады па развіцці ракетабудавання. А потым амаль адразу, як кажуць, без змены дэкарацый, ужо беларускія журналісты прэзідэнцкага пула атрымалі магчымасць задаць свае пытанні. І ў размове з імі ў Аляксандра Лукашэнкі было нямала інсайдаў — інфармацыі, якая дагэтуль нідзе не агучвалася, якая цікавіць многіх (і не толькі журналістаў). Кіраўнік краіны, як заўсёды, гаварыў шчыра і дасціпна. Падрабязнасці — ад карэспандэнтаў «Звязды», якія таксама ўдзельнічалі ў размове з Першым.



ЧЫМ ЗАЧАРОЎВАЕ БЕЛЫ ФАРФОР 14



НАВУКУ — У ЖЫЦЦЁ

## РОДНАЕ ЗЕРНЕ — У РОДНУЮ ГЛЕБУ

### Айчынныя сарты збожжавых даюць ураджайнасць да 150 цэнтнераў з гектара

Пакуль у гаспадарках краіны завяршаецца жніво, і распачынаецца сяўба азімых, мы накіраваліся ў месца, дзе ўжо сёння клапоцяцца пра ўраджай будучага года. Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па земляробстве забяспечвае ўсе гаспадаркі краіны якасным насенным матэрыялам. Дзякуючы перспектыўным распрацоўкам, глыбокаму аналізу і доследнай рабоце вучоных ствараецца насенне, якое з'яўляецца адным з найлепшых у свеце. Пра вопыт беларускіх вучоных, пра тое, як закладваецца аснова будучых ураджаяў, мы пагаварылі з Эромай УРБАНАМ, першым намеснікам генеральнага дырэктара НПЦ па навуковай рабоце, доктарам сельскагаспадарчых навук, прафесарам, членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

СТАР. 8–9

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

# АД ПЫТАННЯЎ ДВУХБАКОВАГА ДА ГЛАБАЛЬНАГА

## Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю кітайскаму медыя



Пытанні Прэзідэнту Беларусі задавала вядучая і карэспандэнт Медыякарпарацыі Кітая (China Media Group) Цзо Юнь. Размова была арганізавана напярэдадні буйных міжнародных мерапрыемстваў у Кітайскай Народнай Рэспубліцы, у якіх возьме ўдзел і беларускі лідар, — саміту ШАС і парада ў Пекіне ў гонар Перамогі над японскімі мілітарыстамі і заканчэння Другой сусветнай вайны.

Медыякарпарацыя Кітая (China Media Group) — дзяржаўная медыяарганізацыя Кітайскай Народнай Рэспублікі, адзін з найбуйнейшых медыякангламератаў свету. Знаходзіцца пад кантролем Аддзела прапаганды Нацыянальнага камітэта Камуністычнай партыі Кітая, падпарадкоўваецца непасрэдна Дзяржаўнаму савету КНР. Ахоп аўдыторыі — звыш мільярда чалавек у Кітаі і за яго межамі. Медыякарпарацыя ўключае 51 тэлевізійны канал, 23 дыяпазоны радыёчастот для вяшчання ўнутры Кітая і праграмы на 44 мовах для міжнароднай аўдыторыі. Сёння медыярэсурсы China Media Group даступны ў 143 краінах і рэгіёнах свету. Вяшчанне ажыццяўляецца кругласутачна на пяці мовах, уключаючы рускую.

Падчас інтэрв'ю было закранута шырокае кола пытанняў, якія датычацца беларуска-кітайскага ўзаемадзеяння і міжнароднага парадку дня ў цэлым. Сярод тэм, якія абмяркоўваліся, — высокі ўзровень адносін Беларусі і Кітая, інтэнсіўнасць візітаў Аляксандра Лукашэнкі ў Паднябесную, даверлівыя сяброўскія адносіны двух лідараў. Журналіст пацікавілася, што ляжыць у аснове моцных беларуска-кітайскіх адносін і якія чаканні ў Прэзідэнта Беларусі ад маючага адбыцца візіту ў Кітай. Размова ішла і пра значэнне членства Беларусі ў ШАС, агульныя падыходы ў пытанні захавання гістарычнай памяці, двухбаковыя маштабныя праекты (у прыватнасці, такія як індустрыяльны парк «Вялікі камень»). Цікавілася журналіст і пазіцыяй беларускага лідара наконт мірнага ўрэгулявання ўкраінскага канфлікту, перагавораў Прэзідэнтаў Расіі і ЗША на Алясцы. Аб гэтым, як заўсёды, Аляксандр Лукашэнка выказаўся адкрыта і падрабязна.

### «ТРЭБА ЗЫХОДЗІЦЬ З РЭАЛЬНАГА, КАБ НЕ СТРАЦІЦЬ БОЛЬШАГА, КАБ НЕ СТРАЦІЦЬ УСЮ УКРАІНУ»

«Мы як ніколі раней блізкія да таго, каб спыніць гэты канфлікт і дамовіцца аб міры паміж Расіяй і Украінай, — перакананы Прэзідэнт, які дастаткова паглыблены ў гэта пытанне.

**— Што датычыцца перагавораў Дональда Трампа і Уладзіміра Пуціна на Алясцы, я гэта ўспрымаю вельмі пазітыўна. І я абсалютна не згодзен з тымі высновамі і заключэннямі, якія гучаць у журналістаў і рознага кшталту спецыялістаў на гэту тэму. Што Пуцін больш атрымаў, Трамп менш атрымаў і прайграў. Паслухайце, калі ты не разумееш у элементарнай дыпламатыі, то не трэба даваць ацэнкі. Гэта розныя людзі, розныя пазіцыі».**

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што Расія і Украіна — гэта бакі, якія ўдзельнічаюць у канфлікце. «Калі Амерыка пастаўляе зброю, то яна не вядзе вайну супраць Расіі, Амерыка не з'яўляецца бокам у гэтай вайне, — патлумачыў ён. — А Дональд Трамп і Амерыка з'яўляюцца пасрэднікамі. І каб глыбей зразумець сітуацыю ў гэтым канфлікце, каб больш сур'ёзна ацаніць сітуацыю з боку Расіі, зразумець Расію ў гэтай вайне, Трамп як пасрэднік (яму трэба выказаць за гэта ўдзячнасць) запрасіў Пуціна на Аляску». За гэта, па словах беларускага лідара, Прэзідэнта ЗША варта не крытыкаваць, а быць яму ўдзячным.

«Ён высветліў пазіцыю ў гэтым канфлікце, ён зразумеў, чаго хоча Расія, — кажучы пра Дональда Трампа, заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Але нават гэта ён не стаў казаць, бо ён — не бок гэтага канфлікту. Тое, што было абмеркавана, — гэта канкрэтыка, па якой будуць размаўляць прэзідэнты Пуцін і Зяленскі, бакі, якія канфліктуюць». Па словах Аляксандра Лукашэнкі, падчас перагавораў на Алясцы Прэзідэнт ЗША задаваў шмат пытанняў Прэзідэнту Расіі і зразумеў пазіцыю апошняга.

«Як ні кажы, а ўсё-такі пазіцыя Расіі для будучага міру тут важнейшая, чым украінская. Чаму? Расія дамінуе сёння на фронце. Вельмі моцна дамінуе. І на галоўным напрамку, Данецкім, у раёне Пакроўска, склалася вельмі небяспечная сітуацыя для ўкраінцаў. Яны адтуль бралі, з асноўнага напрамку, войскі, баяздольныя, і перакідвалі на поўнач, у раён Сум, Харкава, дзе расіяне ўклініліся на тэрыторыю Украіны. Яны перакінулі часці, тым самым аслабіўшы асноўны напрамак на Данбасе, у Данецкай вобласці. Гэта вельмі небяспечна, катастрафічна небяспечна. І адбылося тое, што адбылося: расіяне наступаюць па ўсёй лініі фронту. Так, спакойна».

Аляксандр Лукашэнка распавёў, што абмяркоўваў гэта пытанне з Уладзімірам Пуціным: наступленне можа быць больш імклівым, але за гэтым — чалавечыя страты. «Яны берагуць людзей, яны берагуць ваеннаслужачых, — падкрэсліў беларускі лідар. — Але ўсюды паціху рухаюцца кіламетр за кіламетрам, кожны дзень вызваляючы новыя паселішчы. Для Украіны — вельмі небяспечна. Украіне трэба сёння спыніцца, трэба заключыць мірнае пагадненне, каб не страціць Украіну ўвогуле».

Па назіраннях Прэзідэнта, Дональд Трамп, які ўзяўся за ўрэгуляванне гэтага канфлікту, магчыма, ужо і не рады. «Ён зразумеў, што гэта сапраўды складана, — патлумачыў беларускі лідар. — Але яму няма куды дзявацца. Як у нас кажуць, саскочыць ужо немагчыма. І я амерыканцаў словы ў словы

# ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ ПАРАДКУ ДНЯ

папярэджваў, калі яны былі задоўга да гэтых перагавораў у мяне: «Вы, кажу, перадайце Трампу, што яму цяпер адступаць нельга». Ён узяўся за праблему гэту, і ён павінен яе вырашыць. І ён можа яе вырашыць. І ён імкнецца яе вырашыць. Вось у чым сутнасць размовы на Алясцы».

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што ў перагаворы па ўрэгуляванні ўкраінскага канфлікту рвуцца еўрапейцы: маўляў, без нас не можа нічога адбыцца. У гэтай сувязі Прэзідэнт ім нагадаў люты 2015 года, калі па ініцыятыве буйных еўрапейскіх краін (Германіі і Францыі) у Мінску сабраліся іх лідары, а таксама Уладзімір Пуцін і тагачасны Прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка, каб спыніць тое, што адбывалася тады ва Украіне.

«Хто перашкаджаў устанавіць трывалы мір? — задаў рытарычнае пытанне беларускі лідар. — Дык яны потым прызналіся: яны сюды прыехалі не мір устанаўліваць, а для таго, каб даць магчымасць пераўзброіцца Украіне. Дык чаго сёння вы крыўдзіцеся, што Трамп вас не запрашае? Навошта вы тут патрэбныя? Вы ж ужо адзін раз паспрабавалі. Амерыка тады не ўмешвалася, хоць я казаў: без Амерыкі міру не будзе, патрэбна падключыць Амерыку. Яны яе не падключалі. Яны самі вырашылі ўстанавіць мір. У 2015 годзе, у лютым месяцы. Правалілі гэта. Свядома гэта зрабілі. Падманулі Расію».

Таму, па словах Аляксандра Лукашэнкі, Дональд Трамп мае рацыю, што Амерыка ў адзіночку спрабуе прасунуць мірныя пагадненні. «Думаю, што гэта шчыра», — падзяліўся кіраўнік дзяржавы і ўдакладніў, што Прэзідэнту ЗША выгадна, калі еўрапейцы выступаюць «ястрабамі».

Аляксандр Лукашэнка разумее, наколькі Дональду Трампу складана ў гэтай сітуацыі, бо ён змагаецца не толькі за мір, за тое, каб зблізіць пазіцыі Украіны і Расіі. Няпроста і таму, што еўрапейцы, саюзнікі Амерыкі, выступаюць супраць гэтага. «Таму чыста ў перагаворным працэсе Трампу ў пэўнай ступені выгадна, што еўрапейцы іграюць такую ролю і займаюць такую пазіцыю, — сказаў Прэзідэнт. — Думаю, найбліжэйшы час пакажа, у якім кірунку будзе развівацца абстаноўка. Але я абсалютна перакананы, я гэта дакладна ведаю ад Прэзідэнта Расіі, ён вельмі хацеў бы, каб наступіў мір паміж Украінай і Расіяй. І многае будзе залежыць ад таго, наколькі Украіна зразумее рэальнае становішча спраў. Усё-такі трэба зыходзіць з рэальнага, каб не страціць большага, каб не страціць усю Украіну».

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што хацелася б, каб урэгуляванне ўкраінскага канфлікту ішло хутчэй, хоць разумее, што вайна ідзе чатыры гады, таму хутка не будзе. «Тут трэба спакойна разабрацца і хоць бы перастаць страляць адзін у аднаго, спыніць наносіць удары па паветры, — лічыць ён. — Спыняцца ваенныя на лініі судакранання на фронце, перастануць страляць адзін у аднаго, не будуць гінуць людзі, як цяпер адбываецца, тады можна гаварыць і аб міры, і аб пасляваенным уладкаванні, і аб рэдказямельных металах. Аб чым заўгодна можна гаварыць. На гэта будзе час. Але лепш, вядома, мір заключыць, калі атрымаецца».

## «ПАТРЭБНЫ ГАРАНТЫІ БЯСПЕКІ»

Адказваючы на пытанне, як можна стварыць эфектыўную ўстойлівую сістэму еўразійскай бяспекі, што павінна быць у яе аснове, Прэзідэнт адзначыў, што бяспека павінна быць непадзельнай. «Яна павінна быць для нас, еўрапейцаў, агульнай, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Сваю ролю ў гэтай сістэме бяспекі павінны іграць усе: ад Беларусі і Расіі да Англіі, Германіі і гэтак далей. Можа быць, з удзелам вядучай краіны — Злучаных Штатаў Амерыкі».

Прэзідэнт нагадаў, што ёсць такая арганізацыя, як АБСЕ (Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе), куды, акрамя еўрапейскіх дзяржаў, уваходзяць ЗША і Канада. Але, як падкрэсліў беларускі лідар, гэтай арганізацыі не чуваць і не відаць. «А трэба было б сабрацца і сур'ёзна кіраўнікам дзяржаў абмеркаваць тое, што тут адбываецца, — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Таму патрэбна не проста дыпламатычная арганізацыя, а ваенна-палітычная арганізацыя. І самае галоўнае, пры гэтым патрэбны гарантыі бяспекі. Трэба дамовіцца. Вось гарантыі бяспекі, калі яны парушаюцца — адказ такі».

Кіраўнік дзяржавы распавёў журналісту, што ў горкім вопыце Беларусі была і такая старонка, узгадаўшы заключаны ў Будапешце дагавор аб вывадзе ядзернай зброі з тэрыторыі Украіны і Беларусі. «Тады нам давалі гарантыі моцныя краіны: і Амерыка, і Вялікабрытанія, і Расія, і гэтак далей, — сказаў ён. — Ну і што? Усё гэта было забытае. Таму трэба дамаўляцца цяпер. А ўсё, што будзе потым, будзе залежаць ад нас, ад нашай палітыкі на еўрапейскім кантыненце. І не толькі на еўрапейскім».

***Інтэрв'ю Прэзідэнта Беларусі будзе трансліравацца ў праграме «Дыялог на высокім узроўні» — гэта адзіная ў Кітаі штотыднёвая праграма на дзвюх мовах (кітайскай і англійскай) на каналах «Сі-Сі-Ці-Ві» і «Сі-Джы-Ці-Эн». 3 кастрычніка 2022 года гасцямі праграмы сталі звыш 130 вядомых сусветных палітычных лідараў. Падрабязнасці цікавай і карыснай размовы з Аляксандрам Лукашэнкам, якая доўжылася паўтары гадзіны, будуць апублікаваны і ў газеце «Звязда».***

**Вераніка КАНЮТА,**
**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

# АД КАГО ЗАЛЕЖЫЦЬ МІР НА ПЛАНЕЦЕ І ЯКАЯ Ў ГЭТЫМ РОЛЯ БЕЛАРУСІ

## Падрабязнасці шчырай размовы Прэзідэнта з журналістамі свайго Пула

Нягледзячы на працяглае інтэрв'ю журналісту кітайскага медыя, Аляксандр Лукашэнка не адмовіў у размове і супрацоўнікам беларускіх сродкаў масавай інфармацыі. Журналісты прэзідэнцкага Пула папрасілі кіраўніка дзяржавы адказаць на пытанні, якія сёння знаходзяцца ў топе навін усіх сусветных медыя.

Найперш Прэзідэнт папрасіў не перабольшваць значэнне яго тэлефоннай размовы з Дональдам Трампам і раскрыў падрабязнасці свайго рабочага графіка, у якім далёка не ўсё публічнае. «У мяне ёсць, як я іх называю, «разгрузачныя» дні: гэта серада і субота, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта свабодныя дні ад публічных мерапрыемстваў. Размовы, перагаворы — непублічныя. Калі б мы сталі іх падсвечваць, вялікая колькасць была б інфармацыі. Такой канкрэтнай, чым агульнай, як гэта бывае на публічных нарадах, паездках і гэтак далей. І дакументаў — процьма. Паўпуда — гэта мінімум. Гэта паўдня займае. А потым я павінен адсачыць сродкі масавай інфармацыі...»

А яшчэ ёсць непублічныя сустрэчы кіраўніка дзяржавы, размовы па тэлефоне і шмат чаго іншага, аб чым не ведае шырокая грамадскасць. Адным словам, выхадныя ў Прэзідэнта ў яго надзвычай насычаным працоўным графіку здараюцца рэдка.

## «ГЭТА ДЗВЕ КРАІНЫ, АД ЯКІХ ЗАЛЕЖЫЦЬ СЁННЯ ЖЫЦЦЁ НА НАШАЙ ПЛАНЕЦЕ»

**?** ***У кіраўніка дзяржавы пацікавіліся, як ён ацэньвае перагаворы на Алясцы, а таксама іх вынікі. Журналісты спыталі, ці згодны Аляксандр Лукашэнка з меркаваннем, якое шырока транслюецца ў медыйнай прасторы, што Дональд Трамп гэтыя перагаворы нібыта прайграў.***

«Што там прайграў Трамп Пуціну? У іх розныя былі ролі. Тое, што ён запрасіў яго на Аляску? Некалькі экзатычна, але прыгожа. Мне Пуцін да гэтага тэлефанаваў, кажа: «Тут абмяркоўваюцца Рым, Жэнева, Турцыя, Эміраты і гэтак далей». Я кажу: «Ну, у Рым ехаць неяк нам, праваслаўным...» «Так, — кажа, — я так і разумею». Адкінулі ўсе гэтыя пункты. Кажа: «Пачакаем, што амерыканцы прапануюць». Заўтра Трамп патэлефанаваў: «Давай на Аляску». Два прэзідэнты, якія абсалютна разумеюць адзін аднаго, сустрэліся на Алясцы. І спрэчкі нават ніякай не было».

**Аляксандр Лукашэнка патлумачыў, што Уладзімір Пуцін прадстаўляў адзін з канфліктуючых бакоў, а Дональд Трамп у гэтай сітуацыі выступаў у якасці пасярэдніка паміж канфліктуючымі бакамі. Адной з мэт амерыканскага лідара было даведацца аб пазіцыі Расіі наконт украінскага пытання. І з гэтай роляй, па словах Прэзідэнта Беларусі, ён выдатна справіўся.**

«Чаго папракаць Трампа, што ён не прывёз нейкія канкрэтныя вынікі?» — заўважыў кіраўнік дзяржавы, адзначыўшы, што падчас заявы для СМІ па выніках перагавораў Уладзімір Пуцін мог гаварыць аб канкрэтыцы, але не палічыў неабходным гэта рабіць. Расійскі лідар выступіў на агульныя тэмы, дыпламатычна, што, па словах яго беларускага калегі, адпавядае яго характару.

«Але Трамп мяне здзівіў, — дадаў Прэзідэнт. — Думаў, ён, як звычайна, пойдзе: гэта абмяркоўвалі, тое, я згодзен, я не згодзен. Ён разумнік. Чатыры хвіліны (доўжылася яго выступленне па выніках перагавораў. — **«Зв.»**). Ён выдатна адыграў сваю ролю. Гэта не таму, што я перастаў яго крытыкаваць пасля гэтай размовы (пасля тэлефоннай размовы Прэзідэнтаў Беларусі і ЗША. — **«Зв.»**). Ён класна адыграў сваю ролю, насуперак усім чаканням. Я таксама чакаў, што ён там разыдзецца і пачне «ляпіць» канкрэтыку. Ён здорава тут сябе павodзіў».

Таму ніхто ў гэтых перагаворах, як падкрэсліў беларускі лідар, не прайграў. І нічога дзіўнага ў сустрэчы Прэзідэнтаў Расіі і ЗША, па меркаванні Аляксандра Лукашэнкі, няма. «Гэта дзве краіны, ад якіх залежыць сёння жыццё на нашай планеце», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

*(Працяг на 4–5-й стар.)*



# АД КАГО ЗАЛЕЖЫЦЬ І ЯКАЯ Ў ГЭТЫМ



**Так, будзем настойваць з расіянамі, каб гэтага не было, каб яны (Украіна. — «Зв.») не былі агрэсіўнай краінай, каб гэта не было плацдармам для нападзення ў будучым на нас.**

## «ГАЛОЎНАЕ — КАБ ПЕРАСТАЛІ ГІНУЦЬ ЛЮДЗІ»

? ***Журналісты пацікавіліся, ці лічыць Аляксандр Лукашэнка магчымай сустрэчу Уладзіміра Пуціна і Уладзіміра Зяленскага, якую актыўна абмяркоўваюць пасля сустрэчы на Аляскі.***

Прэзідэнт падкрэсліў, што сустракацца і размаўляць павінны непасрэдныя ўдзельнікі канфлікту. «Тое, што амерыканцы і еўрапейцы вядуць проксі-вайну, — гэта мы ведаем. Ну, і кажуць, што і кітайцы, іранцы, і — я не адмаўляю — беларусы дапамагаюць расіянам, — гэта таксама. Але ні Кітай, ні мы, ні Іран не ваюем там. А непасрэднымі бакамі канфлікту з'яўляюцца Украіна і Расія», — звярнуў увагу ён.

Кіраўнік дзяржавы, кажучы дыпламатычна, расказаў, што перагаворы Расіі і Украіны — «на стале», іх можна пачынаць хоць заўтра. І калі расійскі бок не раз казаў, што гатовы да перагавораў, то ва ўкраінскага думкі мяняюцца. «І расіяне думаюць: «Гатовы прэзідэнт Зяленскі да перагавораў ці не?» Яны думаюць, што не гатовы. Напэўна, зыходзячы з яго заяў, гэта можна зразумець», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. Але параіў не забываць, што, акрамя заяў у СМІ — своеасаблівай дымавой заслоны — ідзе кулуарная, непублічная работа. Работа па арганізацыі перагавораў таксама вядзецца.

«Ёсць указы, што Зяленскі гатовы на абмен тэрыторыі. Гэта пазіцыя Злучаных Штатаў Амерыкі, яны займаюць разумную пазіцыю, сёння рэаліі такія, што, калі не абмяняцца тэрыторыямі, заўтра можа знікнуць Украіна. І калі ўкраінцы не ідуць на прапановы амерыканцаў... але без Амерыкі, без грошай амерыканскіх і зброі асабліва перамагчы немагчыма, — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

**— Я Пуціну задаў пытанне: няўжо еўрапейцы без амерыканцаў украінцам не могуць паставіць зброю? Не. Без амерыканскай зброі Еўропа наогул ваяваць не можа. Вы ўяўляеце, наколькі яны спадзяваліся на ЗША, не развіваючы свой ваенна-прамысловы комплекс?»**

Прэзідэнт нагадаў, што яшчэ ў 2015 годзе была магчымасць спыніць вайну, але ў Мінску еўрапейскія лідары сабраліся, каб падмануць расіян. Наступствы пажынаюць цяпер. Аляксандр Лукашэнка параіў вытрымаць час, ён расставіць усё на свае месцы.

Беларускі лідар расказаў, што называў Дональду Трампу этапы свайго бачання развіцця сітуацыі ва Украіне. Падзяліўся гэтым і з журналістамі: «Першае, я думаю, што яны спыняць страляць адзін у аднаго на лініі судакранання і абвесцяць паветранае перамір'е. Ракеты не будуць лётаць, беспілотнікі і ў адзін, і ў другі бакі. Гэта вельмі важна, і для Расіі ў тым ліку». Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што і Расія, і Украіна ўжо ў поўнай меры на сабе адчулі цяжар ракетных удараў, і ні адзін бок не хоча іх працягваць.

Аляксандр Лукашэнка распавёў інсайдарскую інфармацыю пра тое, што ў расійскага боку была магчымасць пайсці на істотную эскалацыю канфлікту, ужыўшы сваю новую зброю — комплекс «Арэшнік», ударыўшы ім па ўрадавых кварталах у Кіеве. Але Уладзімір Пуцін, якога на Захадзе называюць агрэсарам, на гэта не пайшоў, адмовіўся нанасіць удары па грамадзянскіх аб'ектах.

Другім этапам урэгулявання сітуацыі беларускі лідар назваў перамір'е, ніякага папаўнення войскаў і боепрыпасаў з двух бакоў. І трэці этап — заключэнне міру. Прэзідэнт адзначыў, што заключыць мірны дагавор будзе вельмі складана. «Галоўнае, каб стралялі перасталі, тады можна сядзець і дамаўляцца, як японцы з Савецкім Саюзам, а цяпер з Расіяй. В'етнам ваяваў з Амерыкай, і з першага дня вяліся перагаворы», — прывёў гістарычныя прыклады Аляксандр Лукашэнка.

? ***Сёння сярод магчымых месцаў правядзення сустрэчы Прэзідэнтаў Расіі і Украіны называецца Мінск. Журналісты спыталі, ці хацеў бы Аляксандр Лукашэнка, каб яны адбыліся ў Беларусі.***

Ён пагадзіўся, што Мінск — гэта ідэальнае і зручнае месца для двух бакоў. Прэзідэнт заявіў, што калі Расія і Украіна дамовяцца правесці гэту сустрэчу ў Мінску, — у Беларусі хоць заўтра падрыхтуюць усё на найвышэйшым узроўні.

**«Я не хварэю на гэту хваробу — «паказаць сябе» або «для іміджу вельмі важна», Так, важна. Але, напэўна, мы перажывём. Я не хварэю гэтымі «хацелкамі» — «прыязджайце ў Мінск» і іншае», — адзначыў беларускі лідар. Ён зрабіў акцэнт на тым, што не важна, дзе адбудзецца гэта сустрэча, важна, каб было прынята рашэнне і канфлікт спыніўся, каб перасталі гінуць людзі.**

Прэзідэнт адзначыў, што Беларусь будзе рабіць усё так, як дамовяцца бакі. У прыклад прывёў абмен палоннымі і параненымі — беларусы выканалі пажаданні з усіх бакоў і дапамагаюць людзям з абодвух бакоў, актыўна ў гэтым удзельнічаюць беларускія пагранічнікі, ваенныя, урачы. «Яны хоць пры абмене камунікуюць. Мы ўжо гэтаму рады», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

## «Я ВЕЛЬМІ ЦАНЮ МАЕ АДНОСІНЫ З ПРЭЗІДЭНТАМ ПУЦІНЫМ»

? ***У размове з журналістамі кіраўнік дзяржавы раскрыў новыя дэталі сваёй тэлефоннай размовы з Прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што праз некаторы час, як яны размаўлялі, сувязь перарвалася. І Дональд Трамп перазваніў зноў.***

«Я кажу: «Дональд, нейкія «ворагі» ўмяшаліся ў нашу размову», — пажартаваў беларускі лідар, калі размова аднавілася.

«Гэта, напэўна, Уладзімір», — з жартам адказаў Дональд Трамп, маючы на ўвазе Прэзідэнта Расіі.

«Ён не такі, ён не будзе ўмешвацца ў нашу размову», — адказаў на гэта Аляксандр Лукашэнка, назваўшы расійскага калегу старэйшым братам.

Тлумачыць нашым людзям, які ўзровень беларуска-расійскіх узаемаадносін, не трэба. Але для тых, хто не ведае ці не да канца разумее, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў:

**«У нас блізкія, сяброўскія адносіны з Прэзідэнтам Пуціным. Мы абмяркоўваем любую тэму. Ён мяне можа пакрытыкаваць, я яму прама ў вочы сказаць магу тое, што яму ніхто не скажа ў сілу пэўных прычын. У нас устанавіліся сяброўскія адносіны перш за ўсё па гэтай прычыне, што мы можам абмеркаваць любую праблему, праўдзіва выказаць у вочы адзін аднаму тое, што мы лічым патрэбным. Я вельмі цаню мае адносіны з Прэзідэнтам Пуціным — сяброўскія, братэрскія».**

Таксама кіраўнік дзяржавы расказаў, што падчас тэлефоннай размовы Дональд Трамп хваліў сваіх людзей, якія раней прыязджалі ў Мінск на перагаворы з беларускім лідарам. «Я сказаў: у цябе добрыя людзі, — удакладніў Прэзідэнт. — Ён мне расказаў пра адваката свайго, што яны даўно знаёмыя, дзе ён яму дапамагаў і як дапамагаў. Такі каштоўны чалавек, я яго называю, «кожную раніцу п'еш каву з Трампам і баішся яму праўду сказаць». Дзякуючы яму (адвакату амерыканскага Прэзідэнта. — **«Зв».**), відавочна, адбылася гэта тэлефонная размова, бо ён выклаў яму ўсю праўду. Ён прыстойны чалавек, вельмі адданы, напэўна, Прэзідэнту».

## «РАЗЛІЧВАЦЬ НА ТОЕ, ШТО МЫ БАНДЫТАЎ ВЫПУСЦІМ, ЯКІЯ ПАЛІЛІ, УЗРЫВАЛІ (І ЯНЫ ГЭТА ПРЫЗНАЮЦЬ), НЕ ВАРТА»

Беларускі лідар расказаў, што закранулася падчас размовы з Прэзідэнтам ЗША і тэма магчымага памілавання і вызвалення асуджаных. Аляксандр Лукашэнка праінфармаваў свайго калегу, што ў Беларусі створана спецыяльная камісія, упаўнаважаная разглядаць адпаведныя запыты ад асуджаных, але канкрэтныя рашэнні застаюцца асабіста за кіраўніком дзяржавы. Такая работа, як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, вядзецца на пастаяннай аснове.

# МІР НА ПЛАНЕЦЕ — РОЛЯ БЕЛАРУСІ

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў: яму не ўсё роўна, што скажа беларускае грамадства аб яго дзеяннях у дачыненні да зняволеных. «Вызвалілі гэтых 16 чалавек, не ўсе ж адназначна гэта ўспрынялі, хаця паўнатой інфармацыі не валодаюць, — заўважыў ён. — Час пакажа. Можа, пасля гэтага лятаць свабодна будзем куды. Санкцыі і гэтак далей... Я людзей ні на каго не абменьваў. Гэта была прапанова амерыканцаў. Гэта амерыканская палітыка — здзелка. Хочаце — давайце так».

Аляксандр Лукашэнка расказаў падрабязнасці ранейшай размовы з амерыканцамі, якія датычацца вызвалення асуджаных: «Хочаце паўтары або дзве тысячы (як яны там лічаць)? Забірайце да сябе, вязіце іх туды.

> **Але разлічваць на тое, што мы бандытаў выпусцім, якія палілі, узрывалі (і яны гэта прызнаюць), не варта. Мы іх выпусцім, а яны зноў супраць нас будуць вайну весці? Тут мяне грамадства не падтрымае».**

Размова на гэту тэму з Дональдам Трампам, па словах кіраўніка дзяржавы, ішла не больш за паўхвіліны.

## «ТРАМП НЕ ТАКІ, ЯКІМ МЫ ЯГО БАЧЫМ»

> **«У размове з Пуціным я потым сказаў: «Трамп не такі, якім мы яго бачым», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Ён абсалютна разумее праблему, разумны абсалютна чалавек. Вырве хтосьці на карысць сабе, пакажуць, што ён запальчывы. Нічога падобнага. Гэта адчуваецца. Гэта чалавек, які разумее. Яму б паболей такіх людзей. Думаю, карысць ад гэтага будзе, тым больш ён настроены на мір».**

Аляксандр Лукашэнка распавёў, што таксама ў размове павіншаваў амерыканскага лідара з яго роляй ва ўрэгуляванні канфлікту паміж Арменіяй і Азербайджанам. «Гэта вялікая справа, супрацьстаяць гэтаму ніхто не зможа», — канстатаваў беларускі лідар.

## «ЗБЕГЛЫЯ НЕ МАЮЦЬ НІЯКАГА ДАЧЫНЕННЯ ДА ПЕРАГАВОРАЎ З АМЕРЫКАНЦАМІ»

? ***Журналісты задалі Прэзідэнту пытанне, якое, напэўна, хвалюе многіх: якое дачыненне збеглыя маюць да перагавораў беларускага і амерыканскага бакоў?***

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што збеглых раздражняе сам факт гэтых перагавораў. І звярнуў увагу, што нават апазіцыі трэба быць аб'ектыўнай і дзейнічаць у інтарэсах людзей: «Калі санкцыі, дык вас і Зянон Пазняк крытыкуе — санкцыі ж, кажа, гэта не супраць «рэжыму», гэта супраць народа, іх трэба здымаць. Разумная пазіцыя. Гэта зразумела нашым людзям у тым ліку. «Не, санкцыі, душыць, душыць і душыць!» Гэта такая вось гадасць з іх прэ».

Прэзідэнт заявіў, што збеглыя да перагавораў з амерыканскім бокам не маюць ніякага дачынення. «Наадварот — яны пра гэта кажуць: каб былі гэтыя «палітвязні». Калі «палітвязні» — ёсць прычына на «дыктатара цiснуць». Няма «палітвязняў» — пра што казаць? Тады і яны не патрэбныя будуць там. Гэта іх пазіцыя, гэта іх палітыка, — сказаў кіраўнік дзяржавы.

> **— Я гэта спецыяльна для нашых кажу, хто сёння адбывае пакаранне, каб разумелі, што яны патрэбныя ў турме, але не на волі. У калоніі — так. Гэта падстава для асуджэння маёй палітыкі і «рэжыму», як яны кажуць. Вось іх палітычнае аблічча».**

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што аналагічная сітуацыя і па спісах 1300 зняволеных, пра якія згадваў Дональд Трамп. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, збеглая апазіцыя перадала ў Амерыку спісы, патрабуючы ад Дзярждэпа ціснуць на Беларусь па гэтых пытаннях. «Мы гэта ўсё ведаем, — сказаў Прэзідэнт. — Яны не рады, што мы дамаўляемся, і ў сябе абмяркоўваюць: "Як без нас? А мы дзе? Нас не бачаць, давайце неяк мы да гэтага прымажамся...»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на прапановы збеглых сесці за стол перагавораў:

> **«Я з кім павінен садзіцца за стол? З тымі, хто хацеў разваліць краіну? Добра, я гэта мог бы пераступіць. Ну, а якая карысць ад іх? Яны што, нам нечым дапамогуць — народу, дзяржаве? Яны нам не памочнікі. А па гразі хадзіць — можна брудам запэцкацца. Навошта гэта мне? Гэта мне не трэба».**

Кіраўнік дзяржавы таксама папярэдзіў амерыканцаў, што ніякіх перагавораў не будзе, калі прадстаўнікі ЗША будуць падыгрываць збеглым. «Кажуць: «Не, мы з вамі вядзём перарагаворы», — перадаў ён рэакцыю амерыканскага боку.

## «ЦЯПЕР МЫ ЧАКАЕМ КАНКРЭТНЫХ КРОКАЎ»

? ***Журналісты пацікавіліся, ці можна казаць аб пэўнай нармалізацыі адносін Беларусі і ЗША на сучасным этапе.***

«Размова — гэта вынік чагосьці. Гэта не проста ні з пушчы, ні з поля ўзяў і патэлефанаваў», — патлумачыў кіраўнік дзяржавы, маючы на ўвазе, што нармалізацыя беларуска-амерыканскіх адносін пачалася значна раней, да размовы двух лідараў. Па яго словах, гэта вынік пэўных крокаў і канкрэтных перагавораў з амерыканскім бокам. Да гэтага было каля пяці сустрэч, апошняя — са спецпасланнікам Прэзідэнта ЗША Кітам Келагам, інфармацыя аб якой была ў адкрытым доступе. Пры гэтым, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, зрабіць публічнай апошнюю сустрэчу прапанавалі амерыканцы.

> **«Мы не супраць, мы не настойвалі на тым, каб гэта было публічна, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Для мяне гэта не мела ніякага значэння, і я разумеў, што ў выніку нейкіх нашых размоў мы там санкцыі не адменім, да канкрэтыкі пэўнай не прыйдзем».**

*(Заканчэнне на 6–7-й стар.)*



# АД КАГО ЗАЛЕЖЫЦЬ МІР І ЯКАЯ Ў ГЭТЫМ РОЛЯ

Па выніках сустрэчы былі прыняты рашэнні аб памілаванні шэрагу асуджаных, аб чым прасіў амерыканскі бок. «Мы ім сказалі: «Хлопцы, мы зрабілі шмат розных крокаў вам насустрач і іншае, — прывёў дэталі перагавораў Аляксандр Лукашэнка. — Цяпер мы чакаем канкрэтных крокаў ад вас. Я нават ніколі не казаў пра санкцыі, клянуся вам. Нашы сказалі, Рыбакоў (Валянцін Рыбакоў, пастаянны прадстаўнік Беларусі пры ААН. — **«Зв.»**) яму сказаў: «Вы ведаеце, што трэба Беларусі». Я забараніў прасіць. Ну, калі здымуць санкцыі з «Белавія» і вы пачнеце спакойна лётаць па свеце, напэўна, гэта важна. Але не думаю, што вы пакутуеце з-за таго, што ў нас санкцыі на «Белавія». У Кітай ляцім, туды ва ўсе краіны ляцім, па Расіі ляцім. Самалёты ўсе лётаюць. Ну так, напэўна, трэба здымаць, бо гэта смешна — увядзенне гэтых санкцый».

Тое самае, па словах кіраўніка дзяржавы, і ў адносінах да калійных угнаенняў. «Усё прадаём, нават прырост, — сказаў ён. — Так, крыху больш губляем на гэтай лагістыцы, але атрымалі за гэты час свае парты. Я ніколі не думаў, што порт — гэта вялікі дэфіцыт для краіны. Страшны дэфіцыт і вялікая выгада».

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, нягледзячы на негатыўны ўплыў санкцый, беларусы прыстасаваліся да новых умоў, наша прадукцыя шмат дзе запатрабавана. «Для нашай краіны з невялікай эканомікай шмат не трэба, — сказаў Прэзідэнт. — Вядома, не было б санкцый — жылі б лепш. Што тут гаварыць... Нічога ў іх добрага няма».

Рэзюмуючы, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што паціху, крок за крокам Беларусь будзе выбудоўваць адносіны з амерыканцамі.

**«Гэта буйная краіна, вельмі важная краіна, — канстатаваў ён. — Вы бачыце, што нават Расія, Кітай імкнуцца з імі дамовіцца. Хоць Кітай можа вельмі проста абысціся без Амерыкі, у іх рычагоў дастаткова. Але хочуць дамовіцца. Нам тым больш Бог загадаў. І мы ў гэтых адносінах будзем супрацоўнічаць».**

Прэзідэнт яшчэ раз паўтарыў: не варта сварыцца і з найбліжэйшымі суседзямі — прыбалтамі, палякамі, з якімі, па яго словах, трэба наладжваць адносіны. «Яны ўжо валам ідуць у Беларусь і праз Беларусь і нешта прапануюць, — сказаў беларускі лідар. — Не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло».

**Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь не ўяўляе пагрозы ні для якой краіны. «Ваяваць мы будзем толькі ў адным выпадку: калі нехта атакуе нас, — падкрэсліў ён. — Вось тады мы будзем ваяваць усімі магчымымі і немагчымымі метадамі».**



## «ЕЎРАПЕЙЦАМ ВАЖНА, ЯКОЙ БУДЗЕ УКРАІНА, АЛЕ ЎСЁ Ў РУКАХ ТРАМПА»

? ***У пачатку тыдня ў Вашынгтоне прайшла сустрэча Дональда Трампа з еўрапейскімі лідарамі. Рэакцыю яна выклікала неадназначную. Журналісты папрасілі нашага Прэзідэнта даць ацэнку гэтай сустрэчы. І цікавіліся яго меркаваннем, чаго насамрэч хочуць еўрапейцы.***

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся: ён верыць у тое, што Дональд Трамп шчыра хоча спыніць гэтую вайну. А тое, як ён паставіўся да кіраўнікоў еўрапейскіх краін, — яны гэта заслужылі. Беларускі лідар нагадаў, што менавіта гэтыя еўрапейцы выступалі катэгарычна супраць Дональда Трампа падчас прэзідэнцкай кампаніі. Вядома, складана добра стаўцца да людзей, якія вялі несправядлівую барацьбу, хацелі пасадзіць у турму, замахваліся на жыццё. «У палітыцы так: што прыйшоў ва ўладу — трэба ўсё забыць», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што калі Дональд Трамп сур'ёзна вырашыў дасягнуць дамоўленасцяў па мірным урэгуляванні канфлікту ва Украіне, то еўрапейцы не змогуць гэтаму супрацьстаяць. «Ім трэба да гэтага неяк падключыцца і адыграць нейкую сваю ролю. Вядома, яны еўрапейцы. Вядома, для іх важна, якой будзе Украіна і які будзе мір ва Украіне, калі аб'ектыўна», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама звярнуў увагу, што падключыцца да перагаворнага працэсу еўрапейцам будзе вельмі цяжка пасля невыканання Мінскіх пагадненняў.

**«Усё залежыць ад Трампа, усё ў руках Дональда Трампа. Калі ён пагодзіцца на тое, што павінен быць мір, справядлівы мір, зробіць усё, каб Пуцін з Зяленскім сустрэліся, пагаварылі і дамовіліся (а гэта таксама шмат у чым залежыць ад Трампа), — еўрапейцы будуць вымушаны або праглынуць пілюлю ці дзесьці прыстроіцца ў хвост», — патлумачыў кіраўнік дзяржавы.**

## «БЕЗ КІТАЯ, БЕЗ ІХ ГАРАНТЫЙ БЯСПЕКІ, У ЛЮБЫМ ПУНКЦЕ СВЕТУ МІР ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ВЕЛЬМІ СКЛАДАНА»

? ***Прадстаўнікі медыя пацікавіліся, ці можа Беларусь выступіць у якасці гаранту бяспекі для Украіны.***

«Калі размова ідзе аб гарантыях бяспекі, гавораць аб пастаянных членах Савета Бяспекі (ААН. — **«Зв.»**), — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Гавораць пра ЗША, КНР, іншыя магутныя краіны, еўрапейскія краіны, якія не з'яўляюцца членамі Савета Бяспекі, — даць такія гарантыі. У тым ліку і пра Беларусь. Але калі я гэта пачую, я падумаў: «Ну, а нам гэта трэба ці не, каб мы камусьці гарантавалі нейкую бяспеку?»

Пры гэтым Прэзідэнт дадаў, што калі ў гэтым плане сапраўды будзе просьба падключыцца, то Беларусь можа пайсці на гэты крок. «Што мы, агрэсары? Падключымся. Але не рвёмся туды», — сказаў беларускі лідар.

**Па словах кіраўніка дзяржавы, еўрапейцы пачалі дэзавуіраваць гэту інфармацыю, хочуць самі выступіць такімі гарантамі бяспекі разам з амерыканцамі. Абмяркоўваецца ў тым ліку магчымасць увесці ва Украіну свае войскі або стварыць магутную ўкраінскую армію. «Расіяне, вядома, цяпер катэгарычна супраць таго, каб там былі замежныя войскі, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта расіянам не патрэбна».**

Прэзідэнт падкрэсліў, што трэба быць рэалістамі. Па яго словах, нават калі цяпер удасца дамовіцца аб скарачэнні арміі ва Украіне або абмежаваннях на аб'ёмы ўзбраенняў, то гэта не значыць, што ў будучым сітуацыя не памяняецца. І ў гэтым плане красамоўны прыклад адносна Германіі, які прывёў кіраўнік дзяржавы, дзе пра ўсе дамоўленасці накont колькасці арміі і іншага ўжо даўно забыліся.

«Так, будзем настойваць з расіянамі, каб гэтага не было, каб яны (Украіна. — **«Зв.»**) не былі агрэсіўнай краінай, каб гэта не было плацдармам для нападзення ў будучым на нас», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, удакладніўшы, што абстаноўка можа скласціся інакш.



Прэзідэнт нагадаў: Зяленскі заяўляў, што яны не хочуць, каб Кітай быў у ліку такіх гарантаў бяспекі, бо гэта краіна нібыта не прадухіліла вайну. «Гасподзь з вамі! Кітай павінен быў умяшацца ў вайну і прадухіліць яе... — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта ты павінен быў рабіць усё, каб у цябе не было вайны. А калі Кітай не будзе гарантам бяспекі (ён член Савета Бяспекі), вы ведаеце, без Кітая, без іх гарантый бяспекі, у любым пункце свету мір забяспечыць вельмі складана. Таму, перш чым ляпаць языком, Зяленскаму трэба трошкі думаць».

## «ТРЭБА МЕЦЬ СВАЁ МЕРКАВАННЕ»

? ***За тры тыдні да сустрэчы на Аляксы беларускі Прэзідэнт у інтэрв'ю амерыканскаму часопісу адзначыў, што Расія гатовая да перагавораў. Усё атрымалася, як казаў Аляксандр Лукашэнка, і ўвесь свет гэта ўбачыў. Ды і наогул кіраўнік дзяржавы часта дакладны ў сваіх прагнозах. Журналісты папрасілі адкрыць сакрэт, дзякуючы чаму яму гэта ўдаецца: палітычнаму досведу, інтуіцыі, непублічнай інфармацыі?***

Прэзідэнт расказаў, што ўважліва слухае розныя меркаванні, аналізуе, параўноўвае. «Гэта паглыбленасць у пытанне. Калі ты ў гэта паглыблены, можаш разважаць на гэтую

# НА ПЛАНЕЦЕ БЕЛАРУСІ

тэму і мець сваё меркаванне. Але гэта тваё меркаванне. Без ілжывай сціпласці, гэта і ў нейкай ступені вопыт», — прызнаўся Аляксандр Лукашэнка.

**Ён нагадаў, як у пачатку спецыяльнай ваеннай аперацыі ў размове з Уладзімірам Зяленскім раіў яму, як пастуціць, раіў спыніць канфлікт, прапанаваў сесці за стол перагавораў.**

«Калі б тады паслухалі тое, што я казаў (і гатовы быў адыграць нейкую ролю), сёння гэтага не было б, і па абласцях Запарожскай, Херсонскай, і Луганскай, і Данецкай нават — па адным Крыме была б размова. Не паслухаў, — нагадаў ён. — І потым, я ж ведаю пазіцыю Прэзідэнта Расіі, калі б ён быў ястрабам, «біць, біць» — то іншая справа. Але ён прапаноўваў і прапануе (мірнае ўрэгуляванне. — **«Зв.»**). Трэба за гэта схапіцца».

Аляксандр Лукашэнка гэтак жа распавёў, што параіў Дональду Трампу нагадаць еўрапейцам аб парушэнні Мінскіх пагадненняў — аргументавана і па фактах. Зноў жа, беларускі лідар моцна паглыблены ў гэта пытанне.

## «ТРАМП ЗАСЛУЖЫЎ НОБЕЛЕЎСКУЮ ПРЭМІЮ МІРУ»

? ***Журналісты папрасілі беларускага лідара ацаніць шанцы Дональда Трампа на Нобелеўскую прэмію міру, да якой ён так імкнецца.***

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што Нобелеўская прэмія дыскрэдытаваная цалкам і стала чыста палітычнай гульнёй. Але ў Амерыцы гэта ўспрымаецца інакш, і Дональд Трамп гэта ўспрымае інакш, для яго гэта важна.

«Так, ён у гэтым плане славалюбівы, амбіцыйны чалавек, але што ў гэтым дрэннага? Чалавек хоча Нобелеўскую прэмію (калі гэта так) — ну і на здароўе, хай атрымлівае! Што для нас у гэтым дрэннага? — задаў рытарычнае пытанне Прэзідэнт. — Калі трэба падтрымаць (Трампу трэба), то, напэўна, ён гэтага заслугоўвае».

**Аляксандр Лукашэнка не сумняваецца, што Дональд Трамп атрымае Нобелеўскую прэмію міру. «Барак Абама да яго... Толькі стаў Прэзідэнтам, нічога не зрабіў — атрымаў Нобелеўскую прэмію. Ён нават развязаў некалькі войнаў. А гэты ж змагаецца за мір. Ды Гасподзь з ім, няхай бы ён атрымаў гэтую Нобелеўскую прэмію. Я асабіста за. Думаю, такой пазіцыі прытрымліваюцца многія, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Галоўнае, што яго будуць паважаць людзі — у Расіі, ва Украіне, у нас. Патэлефанавалі адзін аднаму — нашы людзі з натхненнем гэта ўспрынялі. «Удзячныя Дональду Трампу» — вось гэта важна, а не тое, што Нобелеўскі камітэт прысудзіць яму гэтую прэмію».**

Прэзідэнт яшчэ раз падкрэсліў, што амерыканскі лідар гэта заслужыў. «Пры ўсіх яго недахопах ён змагаецца за мір больш, чым хто-небудзь», — адзначыў ён. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, такія палітыкі, як Дональд Трамп і Сі Цзіньпін, могуць паўплываць на ход падзей у свеце, дамагчыся міру, таму што гэта дзве магутныя краіны, якія могуць паўздзейнічаць у любым пункце свету на развіццё падзей.

**Вераніка КАНЮТА, Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона**: ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1

**Продавец:** ООО «Бизнес РМ», 213931, Могилевская обл.. Кировский р-н, г. Кировск, ул. Кирова, 70

| п/п | Предмет аукциона, реализуемый одним лотом: | Инв. номер | Общая площадь |
|---|---|---|---|
| 1 | Здание спорткомплекса бокса «Отеля «Вишневый сад» (Здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения), расположенное по адресу: Могилевская обл., Бобруйский р-н, Сычковский с/с, около д. Щатково, 30/2. **Обременение: Ипотека в ОАО «Белагропромбанк»** | 710/С-24359 | 1772,0 кв. м |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 720884000015000005:** предоставлен на праве собственности для содержания и обслуживания зданий и сооружений спорткомплекса общей площадью 0,2625 га | | | |
| 2 | Гостиница «Отель «Вишневый сад» (Здание гостиниц, мотелей), по адресу Могилевская обл., Бобруйский р-н, Сычковский с/с, 30/2, гостиница. **Обременение: Ипотека в ОАО «Белагропромбанк»** | 710/С-24342 | 292 кв. м |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 720884000015000006:** предоставлен на праве собственности для содержания и обслуживания зданий и сооружений спорткомплекса общей площадью 0,0514 га | | | |

| | |
|---|---|
| **Начальная цена без НДС (снижена на 10 %)** | **4 727 573,93 бел. руб.** |
| **Шаг аукциона** | **236 378,70 бел. руб.** |
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **08.09.2025** в 13.00 по адресу: **г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **05.09.2025** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Любовь, тел. 8044-704-92-06

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайтах организатора аукциона www.ipmtorgi.by, www.cpo.by**

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа: ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более 30 (тридцати) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением СовМина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица».
К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке.
С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** и вознаграждение (3 % от цены продажи лота) на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 19.07.2025 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел. +375 44 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |



**Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» информирует о проведении 23 сентября 2025 г. в 10.00 повторных электронных торгов С ПОНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ НА 80 % по продаже имущества, принадлежащего РУП «Производственное объединение «Белоруснефть»**

**Предметы электронных торгов:**

**Лот № 1: автомобиль ГАЗ 2752,** рег. знак ЕС9744, 2005 г. выпуска. Тип: грузопассажирский фургон. Цвет: сине-зеленый. Номер кузова (рамы) 27520050168365 X9627520050404889. Объем двигателя: 2,4 л. бензин. Не на ходу, самовывоз. Местонахождение: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Энергетиков, 4.
**Начальная цена лота № 1: 763,31 руб.** (в т. ч. НДС 20 %).
**Задаток: 76,33 руб.**

**Лот № 2: автомобиль ГАЗ 2752,** рег. знак АА8385-3, 2006 г. выпуска. Тип: грузопассажирский фургон. Цвет: красный. Номер кузова (рамы) X9627520070515830. Объем двигателя: 2,4 л, бензин. Не на ходу, самовывоз. Местонахождение: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Энергетиков, 4.
**Начальная цена лота № 2: 814,25 руб.** (в т. ч. НДС 20 %).
**Задаток: 81,43 руб.**

**Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки:** Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артёма, 23, тел.: +375 232 324647; 321895; +375 29 1704647; **электронный адрес ЭТП: www.gostorg.by;** сайт: ino.by; e-mail: auction-gino@gino.by.

**Извещение о проведении аукциона опубликовано 21.08.2025 г. на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by по ссылке на ЭТП «GOSTORG» и Гомельского областного исполнительного комитета gomel-region.by.**

УНП 401166490



Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390. (www.cpo.by) |
| **Продавец** | ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», 220028, г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 23. УНП 807000270. |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191 224 638 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронного аукциона:**
**Грузовой специальный автомобиль FORD TRANSIT VAN INDEEC 29459-04,**
рег. знак АР 8178-7, 2010 г. в.,
по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 69.
**Начальная цена с НДС 20 % – 4 688,75 руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона размещено на странице лота во вкладке «Документы». Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **10 %** от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 25.07.2025 г.

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до момента определения победителя торгов, без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 03.09.2025 г.** с 11.00 до 13.00

**Заявки на участие в торгах принимаются по 02.09.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Алексеевичи-Агро», Брестская обл., Дрогичинский р-н, д. Немержа, ул. Ленина, д. 34 |

**Предмет электронных торгов – имущество, реализуемое одним лотом.**
Адрес: Брестская обл., Дрогичинский р-н, Немержанский с/с, 16, 16/1, 16/2, 16/3, 0,3 км восточнее д. Переспа

1. **Молочный блок**, инв. номер 121/С-18347, общей площадью 94 кв. м.
2. **Телятник**, инв. номер 121/С-18348, общей площадью 1584,7 кв. м.
3. **Склад № 3**, инв. номер 121/С-18349, общей площадью 180,2 кв. м.
4. **Здание трансформаторной**, инв. номер 121/С-18350, общей площадью 47,8 кв. м

**Сведения о земельном участке с кадастровым номером 122084500001000199:** предоставлен на праве аренды по 27.08.2073 г. общей площадью 3,1723 га для строительства и обслуживания зданий и сооружений фермы

**Начальная цена, с НДС 20 % – 59 952,00 бел. руб. (снижена на 60 %)**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 15 (пятнадцать) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 31.07.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **04.09.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **03.09.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ЗАО «ГОРИЗОНТ-БЕЛИНВЕСТ-ДЕВЕЛОПЕР», 220029, г. Минск, ул. Красная, д. 7, ком. 4. УНП 191438026 |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1**

**Здание магазина продовольственных товаров с помещением для хранения продуктов питания** (Здание нежилое), инв. № 710/С-11693, общ. пл. 664,4 кв. м, по адресу: ***Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Урицкого, д. 27. Обременение: договор аренды***


Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета www.minsk-region.gov.by, Смолевичского районного исполнительного комитета https://isp@smolevichi.gov.by

УНП 600046589




# «НЕ ДАПУСКАЕМ, КАБ ДЗІЦЯ ВЫБІРАЛІ, ЯК У КРАМЕ»

## Як стаць усынавіцелем і пра што спытаць сябе перад гэтым



Неад'емнае права на бацькоўскую любоў і клопат ёсць у кожнага дзіцяці. Права гэта прапісана ў міжнародных канвенцыях і канстытуцыях дзяржаў, але адносіцца, мабыць, да яшчэ больш высокай юрысдыкцыі: яно — ад Бога. А калі склалася так, што маленькі чалавек пазбаўлены бацькоўскай любові? На дапамогу можа прыйсці ўсынаўленне. Аднак гэта вельмі сур'ёзны крок. Як падрыхтавацца да ўсынаўлення, пра што падумаць і як рэальна ацаніць свае сілы, мы спыталі ў дырэктара Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Таццяны БЯЛЕВІЧ.

***— Таццяна Аляксееўна, давайце разбяромся з тэрмінамі. Што з юрыдычнага пункту гледжання азначае тэрмін «усынаўленне»?***

— Згодна з заканадаўствам, усынаўленне — гэта заснаваны на судовым рашэнні юрыдычны акт, у сілу якога паміж усынавіцелем і ўсыноўленым узнікаюць такія ж правы і абавязкі, як паміж бацькамі і дзецьмі ў біялагічнай сям'і. Па сутнасці, гэта добраахвотнае прыняцце на сябе бацькоўскай ролі ў адносінах да чужога дзіцяці. Разам з тым у прыярытэце — нацыянальнае ўсынаўленне. Усынаўленне міжнароднае — з'ява рэдкая, паколькі наша мэта — каб беларускія дзеці заставаліся жыць у сваёй краіне. Увогуле, ключавы тэзіс, якім мы кіруемся ў дзейнасці, — «Кожнае дзіця павінна жыць у сям'і». Гэта глабальная місія датычыцца не толькі ўладкавання дзяцей у замяшчальныя сем'і, але і работы па прафілактыцы сямейнага недабрабыту. У ідэале кожнае дзіця павінна жыць у біялагічнай сям'і. Але, калі ўсё ж па нейкіх прычынах дзіця застаецца без бацькоўскага клопату, мы імкнёмся ўладкаваць яго на сямейныя формы выхавання. У рэспубліцы існуе некалькі форм сямейнага выхавання: усынаўленне (удачарэнне), апека (папячыцельства), прыёмная сям'я і дзіцячы дом сямейнага тыпу.

Дзве апошнія формы ўяўляюць сабой інстытут так званага прафесійнага замяшчальнага бацькоўства, якому ў нашай краіне ўдзяляецца вялікая ўвага. Прыёмныя бацькі і бацькі-выхавальнікі — работнікі ўпраўленняў і аддзелаў адукацыі. Яны атрымліваюць зарплату, маюць працоўны стаж, а таксама працоўны водпуск.

***— Усыноўленае дзіця мае права ведаць свае карані?***

— Заканадаўства нашай краіны дае магчымасць захаваць таямніцу ўсынаўлення, але мы працуем над усвядомленасцю ўсынавіцеляў і грамадства ўвогуле, і людзі разумеюць: дзіця мае права ведаць свае карані. Як правіла, на ўсынаўленне ідзе невялікая колькасць дзяцей да года-двух, якія нічога не памятаюць аб кроўнай сям'і. У большасці ж выпадкаў гэта дзеці, якія прайшлі нялёгкі шлях, што не сцерці з памяці. Мы рэкамендуем усынавіцелям знайсці правільны падыход, каб паведаміць дзіцяці аб яго жыццёвым шляху. Расказваем, што псіхолагі нашага цэнтра нават могуць прысутнічаць пры такой размове. Дарэчы, найлепшы час для яе — узрост каля 10 гадоў.

***— Наколькі папулярна ўсынаўленне ў нашай краіне? Сустракала інфармацыю, што жадаючых усынавіць дзіця ў Беларусі больш, чым дзяцей на ўсынаўленне...***

— Гэта не зусім так, на жаль. Сапраўды, у лісце ўліку кандыдатаў ва ўсынавіцелі больш за 200 чалавек, якія «чакаюць сваё дзіця». Чаканне можа зацягнуцца на год і на два, бо ўсынавіцелі арыентуюцца на стэрэатып, што дзіця павінна быць зусім маленькім, каб яго мінулая гісторыя не замінала ў пабудове іх сям'і. З усіх кандыдатаў-усынавіцеляў 95 % мараць усынавіць дзіця да 6 гадоў, палова з іх мараць аб дзіцяці да 1-2 гадоў. А такіх у банку даных вельмі мала. І, вядома, сюды дабаўляецца пытанне здароўя дзіцяці — згодных усынавіць падлетка ці дзіця-інваліда няшмат.

Спецыялістам нашага цэнтра, праўда, удаецца часам пераканаць кандыдатаў ва ўсынавіцелі ссунуць узроставую планку дзіцяці хаця б да 5—6 гадоў. Між тым большасць дзяцей у рэспубліканскім банку даных дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, што падлягаюць усынаўленню, — гэта падлеткі. Чаму так адбываецца? Дзіця не адразу пазбаўляецца біялагічнай сям'і. З праблемнымі сем'ямі працуюць спецыялісты, часам нават па некалькі гадоў. І ў банк даных дзіця трапляе ўжо ў дастаткова дарослым узросце. Тут на дапамогу прыходзіць рэсурс дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, апека (папячыцельства), патранат. Дзякуючы такім формам жыццеўладкавання, дзіця мае магчымасць атрымаць навыкі сацыялізацыі і сямейнага выхавання, каб у далейшым пабудаваць уласную сям'ю па правільных прынцыпах.



### «СЯРОД УСЫНАВІЦЕЛЯЎ — САМЫЯ ЗВЫЧАЙНЫЯ ЛЮДЗІ»

***— Які асноўны матыў у людзей, што адважыліся на ўсынаўленне?***

— Асноўны матыў — гэта калі сямейная пара не можа мець дзяцей. Людзі хочуць рэалізавацца як бацькі, стаць паўнавартаснай сям'ёй. Ёсць тыя, хто дасягнуў кар'ерных вышынь і матэрыяльнага дастатку, але адчуваюць у душы незапатрабаваныя любоў і цеплыню, якімі жадаюць падзяліцца. Гэтыя людзі часам ідуць на ўсынаўленне падлетка або дзіцяці з праблемамі са здароўем. Аднак такіх сярод усынавіцеляў не больш за 5 %.

***— Наколькі тыя, каго ўсынаўляюць, а таксама кроўныя дзеці ўсынавіцеляў могуць паўплываць на сітуацыю ўсынаўлення?***

— Калі ідзе працэс усынаўлення, у біялагічных альбо ўсыноўленых дзяцей усынавіцеляў пытаюць іх меркаванне. Дзеці нараўне з бацькамі праходзяць псіхалагічную дыягностыку. Суддзя, прымаючы рашэнне, мае заключэнне псіхолага: як дзеці рэагуюць на з'яўленне ў сям'і яшчэ аднаго чалавека. І калі рэакцыя негатыўная, суд у сукупнасці іншых фактараў можа прыняць рашэнне аб адмове ва ўсынаўленні. Што ж датычыцца дзяцей, у адносінах да якіх разглядаецца пытанне аб усынаўленні, пачынаючы з 10 гадоў іх меркаваннем цікавяцца, і, магчыма, яно будзе ключавым у прыняцці рашэння судом.

Станоўча зарэкамендаваў сябе правераны інструмент, які дазваляе актывізаваць сямейнае жыццеўладкаванне дзяцей-сірот — рэспубліканскі інфармацыйны партал dadomu.by. За больш чым 10 гадоў працы кожнае трэцяе дзіця, анкета



якога размешчана на партале, было ўладкавана ў сям'ю. З 10-гадовага ўзросту дзіця дае згоду (нязгоду) на размяшчэнне інфармацыі аб ім на партале. І дзеці часам адмаўляюцца. У дзіцячых дамах сямейнага тыпу, дзіцячых гарадках і вёсках у іх ёсць сябры, круг зносін, створаны ўсе матэрыяльныя, псіхалагічныя, бытавыя ўмовы. І калі, дапусцім, праз 2-3 гады яны атрымаюць пашпарт і стануць дарослымі, навошта ім прывыкаць да новай сям'і?

***— Якія патрабаванні прад'яўляюцца да кандыдатаў: жыллёвыя ўмовы, матэрыяльны дастатак, узрост?..***

— Ёсць нарматыўна-прававыя акты, якія рэгламентуюць гэтыя пытанні. Крытэрыі дакладныя, але яны невысокія па парозе. Сярод усынавіцеляў — людзі самыя звычайныя: касіры ў крамах, працаўнікі заводаў, работнікі сельгаспрадпрыемстваў, інжынеры, бухгалтары... Калі вы працаздольны і адказны чалавек без псіхічных захворванняў і шкодных звычак, у вас ёсць усе магчымаці стаць усынавіцелем.

***— Колькі часу праходзіць з моманту, калі чалавек прымае рашэнне аб усынаўленні, і да моманту, калі ён становіцца ўсынавіцелем?***

— Падрыхтоўка дакументаў доўжыцца каля трох месяцаў. Чалавек звяртаецца ва ўпраўленне адукацыі па месцы жыхарства. Спецыяліст апекі расказвае пра ўсе формы сямейнага ўладкавання, кансультуе аб той форме, якая цікавіць грамадзяніна. Выдае пералік дакументаў, якія трэба сабраць, запісвае чалавека ў групу падрыхтоўкі кандыдатаў-усынавіцеляў пры сацыяльна-педагагічным цэнтры раёна. Нацыянальны цэнтр усынаўлення таксама рыхтуе кандыдатаў ва ўсынавіцелі. У межах праграмы падрыхтоўкі праводзяцца юрыдычныя кансультацыі, псіхалагічная дыягностыка, па яе выніках — карэкцыйныя заняткі. Спецыялісты расказваюць аб рызыках, тонкасцях узроставай псіхалогіі. Наш прынцып — сумленна папярэджваць аб усіх сітуацыях, якія могуць узнікнуць пры выхаванні чужога дзіцяці. У тэорыі ўсе думаюць: проста буду любіць як свайго. Але ж, каб па-сапраўднаму палюбіць чужое дзіця, іншым разам патрабуецца працяглы час. Адаптацыя адбываецца ва ўсіх, і не заўсёды хутка.

***— Як праходзіць знаёмства ўсынавіцеляў і дзіцяці?***

— Знаёмства — правільнае слова. Мы не дапускаем, каб дзіця выбіралі, як у краме. Калі падыходзіць чарга кандыдата, старшыя інспектары па ахове дзяцінства Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення прапануюць анкеты тых дзяцей, якіх на дадзены момант можна ўсынавіць. Калі кандыдат-усынавіцель выказвае згоду на сустрэчу з канкрэтным дзіцем, яму выдаецца накіраванне, ён едзе ў тую ўстанову, дзе знаходзіцца дзіця. Знаёмства адбываецца ў прысутнасці спецыялістаў. Калі ўсё складваецца паспяхова, бацькі даюць згоду на ўсынаўленне і праходзяць усе ўстаноўленыя заканадаўствам юрыдычныя працэдуры.

## «ПРАВІЛЬНЫ МАТЫЎ — ЖАДАННЕ ДАРЫЦЬ ЦЕПЛЫНЮ І КЛОПАТ, НЯГЛЕДЗЯЧЫ НІ НА ШТО»

***— Ці бывае, што ўсыноўленае дзіця бацькам так і не ўдалося палюбіць?***

— Бывае. Бывае і адваротны варыянт: дзіця не змагло прывязацца да ўсынавіцеляў. Але такія выпадкі рэдкія. Да гонару нашага грамадства хачу сказаць: беларусы — адказныя, спагадлівыя людзі, і выпадкі адмены ўсынаўлення ў нас сапраўды адзінкавыя.

***— Чаму яны ўсё ж здараюцца?***

— Часам бацькі не спраўляюцца з дыягназам дзіцяці: некаторыя дыягназы патрабуюць сур'ёзных матэрыяльных і фізічных выдаткаў. Але бацькі не застаюцца сам-насам з праблемамі. Дзяржава прадастаўляе і педагагічную падтрымку, і сацыяльную, і медыцынскую, і матэрыяльную. Так, да 16 гадоў на ўсыноўленае дзіця па заяве ўсынавіцеля выплачваецца штомесячная дапамога (сёння яна складае каля 500 рублёў). Наладжана сістэма сацыяльна-педагагічных цэнтраў, якія аказваюць комплексную псіхолага-педагагічную падтрымку па любой праблеме. Але больш частая прычына адмены ўсынаўлення — класічная неадпаведнасць «чаканне — рэальнасць». Пераацэнка сваіх сіл. Усынавіцель прымае трохгадовага «анёла», а праз 10 гадоў той становіцца яршыстым падлеткам. Калі гэта біялагічнае дзіця, максімум што мы можам сказаць — «татавы гены». А калі ўсыноўленае, закрадаецца думка: «Гэта гены яго асацыяльных бацькоў». Педагогі-псіхолагі працуюць з такімі сем'ямі і ў многіх выпадках адводзяць іх ад няправільнага рашэння, наладжваюць паразуменне ў бацькоўска-дзіцячых адносінах. Хачу падкрэсліць, што дзеці, за плячыма якіх няпросты вопыт жыцця ў біялагічнай сям'і — больш эмпатычныя, чым тыя, у каго з самага пачатку ўсё было добра. Яны схільны цаніць дабро і спагаду. Усыноўленае дзіця хутчэй, чым кроўнае, даруе маці, нават калі яна ў нейкі момант сарвецца.

***— А наколькі важная генетыка?***

— Важная. Але сацыяльны аспект адыгрывае непараўнальна больш значную ролю. Генетыка — гэта нават не 50 % таго, якім вырасце чалавек, а значна менш. Калі дзіця трапляе ў сям'ю, дзе яго выхоўваюць з любоўю і клопатам, то становіцца добрым чалавекам і паўнавартасным грамадзянінам.

***— Каму б вы не раілі ўсынаўляць дзіця?***

— Людзям, якія дакладна не вызначыліся, для чаго ім гэта трэба. У некаторых выпадках сапраўдныя матывы хаваюцца ўсынавіцелямі. Пераважна таму, што ўсынавіцель усведамляе: з такім матывам яму ніхто дзіця не аддасць. А часам чалавек і сам не ўсведамляе, што ім кіруе. Да такіх матываў адносяцца: жаданне захаваць сям'ю, утрымаць мужа (жонку); самазацвердзіцца ў вачах навакольных; атрымаць сацыяльную павагу за добры ўчынак; пазбавіцца ад комплексу непаўнавартаснасці (у прафесіі я адбылася, замуж выйшла, а вось у пытанні бацькоўства — прочырк). За кожным з гэтых матываў стаіць чаканне, што ўсынаўленне дапаможа вырашыць праблему і адчуць сябе шчаслівым. Але спробы вырашыць такія праблемы ўсынаўленнем, як паказвае вопыт, асуджаны на няўдачу, бо корань — не ў адсутнасці дзяцей, а ў асобе ўсынавіцеля або яго ўнутрысямейных адносінах. Пакуль вы не разбярэцеся ў сваіх праблемах, пабудаваць паўнавартасную сям'ю, дзе шчаслівыя і бацькі, і дзіця, не атрымаецца. Правільны матыў усынаўлення — жаданне дарыць цяпло душы, любоў і клопат, нягледзячы ні на што. І, на шчасце, гэта самы распаўсюджаны матыў людзей, якія звяртаюцца да нас.



**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», ул. Немига, 40, пом. 46, офис 2, г. Минск, 220004. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ООО «Вентускар». 220090, г. Минск, тр-т Логойский, д. 22А, пом. 171, оф. 5 |
| **Оператор ЭТП/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», ул. Немига, 40, пом. 46, офис 1, г. Минск, 220004, **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов – транспортные средства (б/у), по адресу: г. Минск, ул. Бурдейного, д. 22**

| № лота | Марка, модель, регистрационный знак, год выпуска | Начальная цена с НДС 20 %, руб. |
|---|---|---|
| 1 | Легковой универсал (UNIVERSAL) **LADA VESTA,** 2018 г. в., р/з 0831 СК-7, № кузова XTAGFK110KY269396 | 20 000,00 (снижена на 20 %) |
| 2 | Легковой автомобиль внедорожник универсал (SUV UNIVERSAL) **MITSUBISHI PAJERO SPORT,** 2018 г. в., р/з 9711 СЕ-7, № кузова Z8TGUKS10HM040439 | 67 490,00 (снижена на 15 %) |

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять)** рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **6 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 19.07.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 09.09.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 08.09.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 29-154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | Гражданин РБ Роговский Виталий Валентинович |

**Предмет электронных торгов –** Объекты недвижимого имущества в количестве 3 ед. общ. пл. **2227 кв. м,** реализуемые одним лотом по адресу: ***Витебская обл., г. Браслав, ул. Промышленная, 13, 13/11, 13/6.***
Сведения о земельных участках: три участка предоставлены на праве аренды (срок действия по 08.10.2122) пл. 0,5208 га, 0,1709 га, 0,0587 га.
Состав имущества размещен на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by**)

**Начальная цена, без НДС – 198 450,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу НБРБ на день оплаты на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) календарных дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов:** в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи, если иной срок не установлен договором купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Извещение о проведении предыдущих торгов опубликовано в газете «Звязда» от 16.07.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **17.09.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **16.09.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |



В **суд Ошмянского района Гродненской области** поступило заявление о признании ЯБЛОНСКОГО Андрея Ивановича, 23.02.1978 г. р., безвестно отсутствующим. Последнее известное местопроживание: Гродненская область, Ошмянский район, аг. Краковка, ул. Первомайская, д. 10.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим какие-либо сведения о месте нахождения Яблонского А.И., сообщить в суд Ошмянского района Гродненской области (г. Ошмяны, ул. Советская, 39) или по номеру телефона 8 01593-44-547

# ЗАЧАРАВАННЕ БЕЛЫМ ФАРФОРАМ




«Тонкі, як папера, гулкі, як званочак, вытанчаны, як нефрыт», — так характарызуюць вядомы ўсяму свету кітайскі белы фарфор. Мінчане і госці сталіцы маюць магчымасць убачыць яго ўжывую: у Кітайскім культурным цэнтры адкрылася тэматычная выстаўка «Кітайскі белы фарфор Дэхуа». Правінцыя Дэхуа — адзін з самых буйных вытворцаў фарфору ў Кітаі, гэта майстэрства там развіваецца ўжо чатыры тысячы гадоў.

Як адзначыла **першы намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі па навуковай, міжнароднай і асветніцкай рабоце Вікторыя КУЗЬМІНА**, выстаўка — чарговы прыклад шматгадовага цёплага супрацоўніцтва і глыбокага сяброўства, рэалізацыі праектаў, накіраваных на збліжэнне дзвюх краін, папулярызацыі кітайскага мастацтва ў Беларусі і беларускага мастацтва ў Кітаі. «Наша цеснае ўзаемадзеянне аказвае значны ўплыў на развіццё культурнага дыялогу Беларусі і Кітая», — заўважыла яна.

Наведвальнікаў адкрыцця выстаўкі чакаў прыемны сюрпрыз: майстар керамічнага мастацтва фарфору Дэхуа Вэй Дафэн падзяліўся сакрэтамі вырабу белага фарфору. Пад яго кіраўніцтвам дарослыя і дзеці змаглі прыняць удзел у майстар-класах па роспісе і лепцы.

Паглядзець на прыгожыя ўзоры традыцыйнага кітайскага мастацтва можна да 7 верасня.

**Віктар ІВАНЧЫКАЎ, фота аўтара.**








## ООО «СидНеА» организует конкурсные торги

| Дата и время проведения | Предмет (право на заключение договоров купли-продажи/аренды) | Начальная цена: сумма в белорусских рублях, эквивалентная долларам США по курсу НБ РБ на день проведения торгов | Общая площадь | Конкурсное обеспечение в бел. руб. | Срок заключения договора купли-продажи/аренды |
|---|---|---|---|---|---|
| **22.09.2025 11.00** | Продажа земельного участка с кад. № 622280800002000054 по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, Путчинский с/с, СТ Минского подшипникового завода «МАРА 2001», 228 | 48000 | 0,1008 га | 2500 | 90 |
| **22.09.2025 12.00** | Продажа земельного участка с кад. № 622285500101000059, с незавершенным законсервированным капитальным строением, с инв. № 620/U-43406 по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский с/с, д. Антосино, ул. Дачная, 12 | 149900 | 0,0966 га | 2500 | 90 |
| **Повторные конкурсные торги** | | | | | |
| **01.09.2025 11.00** | Аренда квартиры с инв. № 500/D-707951381 по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, д. 170, кв. 201 | 580 | 69.5 кв. м | 860 | 10 |
| **Изменение цены по объекту, опубликованному в газете «Звязда» № 151 (30539) от 08.08.2025** | | | | | |
| **08.09.2025 12.30** | Продажа квартиры с инв. № 500/D-7988224858, расположенной по адресу: г. Минск, ул. Николы Теслы, д. 30, кв. 19 | 89500 | 36,7 кв. м | 2500 | 90 |
| **08.09.2025 15.00** | Продажа готового бизнеса – магазин по продаже сантехнического оборудования, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Богдановича, д. 134 | 17500 | 17,6 кв. м | 2500 | 90 |
| **08.09.2025 10.00** | Продажа квартиры с инв. № 500/D-7988198051, расположенной по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, д. 59, кв. 52 | 132000 | 41,7 кв. м | 2500 | 90 |
| **Изменение цены по объекту, опубликованному в газете «Звязда» № 156 (30544) от 15.08.2025** | | | | | |
| **15.09.2025 11.00** | Продажа квартиры с инв. № 500/D-360913 по адресу: г. Минск, пр-т Рокоссовского, д. 77, кв. 638 | 94500 | 64,4 кв. м | 2500 | 90 |
| **Изменение времени и цены по объекту, опубликованному в газете «Звязда» № 156 (30544) от 15.08.2025** | | | | | |
| **15.09.2025 9.00** | Продажа квартиры с инв. № 602/D-23430 по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Новая Заря, д. 14, кв. 52 | 32000 | 55,4 кв. м | 2500 | 90 |

Торги состоятся по адресу: г. Минск. ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7 этаж.
Срок внесения конкурсного обеспечения и приема заявлений с прилагаемыми к нему документами прекращаются за один рабочий день до проведения торгов по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7 этаж.
Конкурсное обеспечение вноситься на р/с BY14MTBK30120001093300123688 в ЗАО «МТБанк», БИК (код) MTBKBY22. Победитель торгов в день проведения подписывает протокол о результатах торгов.
Иные условия проведения объявленных конкурсов: право подачи и подписания заявления о государственной регистрации договора купли-продажи и основанных на нем прав предоставляется покупателю.
Лицо, выигравшее торги, определяется в соответствии с правилами проведения конкурсов по продаже (аренде) имущества ООО «СидНеА», утвержденным приказом директора от 05.03.2024 № 9-ОД.
Организатор вправе отказаться от конкурсов (повторного конкурса) в любое время до начала торгов.

**Телефон для справок (+37529) 171-50-50**

УНП 193734126



## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА 25 сентября 2025 г.

по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в **аг. Кленник, д. Степша, д. Доброводка д. Курганье, д. Кленник Низ Курганского сельсовета Смолевичского района Минской области.**

*Организатор аукциона: Курганский сельский исполнительный комитет, 222230, д. Курганье, ул. Центральная, 8*

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **аг. Кленник** | 624882505601000170 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 8 500 |
| 2 | **д. Степша, ул. Тихая, 2** | 624882510101000007 | 0,1491 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 6 000 |
| 3 | **д. Степша, ул. Тихая, 4** | 624882510101000008 | 0,1496 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 6 000 |
| 4 | **д. Курганье, ул. Центральная, 7** | 624882506601000159 | 0,2500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 13 600 |
| 5 | **д. Доброводка, ул. Мира, д. 46** | 624882502101000010 | 0,1705 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 8 000 |
| 6 | **д. Кленник Низ** | 624882506101000056 | 0,2500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 13 600 |
| 7 | **д. Курганье, ул. Центральная, д. 51** | 624882506601000012 | 0,2500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 13 600 |
| 8 | **аг. Кленник** | 624882505601000193 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 8 500 |

**Аукцион состоится 25 сентября 2025 г. в 15.00 в Курганском сельском исполнительном комитете по адресу: д. Курганье, ул. Центральная, 8, зал заседаний.**
Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: **https://au.nca.by,** Смолевичского райисполкома: **http://www.smolevichi.gov.by.**

УНП 600023808

ВАРТА ВЕДАЦЬ

# НЮАНСЫ СМАКУ

## Як выбіраць спецыі?



У Якуба Коласа ў «Новай зямлі», у главе «Раніца ў нядзельку», згадваюцца спецыі, якія ўжывала простая беларуская сям'я: «цыбуля, перчык, ліст бабкоў...» У сучасных гаспадынь спіс прыправаў можа быць значна шырэйшы, хоць нямала і тых, каму па-ранейшаму хапае цыбулі, чорнага перцу і лаўровага ліста. Але калі звыклыя стравы надакучылі і ўсё, што вы гатуеце, здаецца вам прэсным, тады ідзём па спецыі!

Спрадвеку людзі выкарыстоўвалі рэзка-араматычныя расліны не толькі для таго, каб надаць новы смак і водар знаёмым стравам і разнастаіць рацыён, але і для падтрымання здароўя і барацьбы з хваробамі. Напрыклад, здольнасцю супрацьстаяць разбуральнаму ўздзеянню вольных радыкалаў прыправы пераўзыходзяць ягады. А ў чайнай лыжцы здробненага сухога арэгана больш вітамінаў Е, С і А, калію і магнію, чым у такім жа аб'ёме суніц або гранатавых зерняў. Прыправы спрыяльна ўплываюць на страўнікава-кішачны тракт, валодаюць болесуцішальным эфектам, могуць узбадзёрыць або вылечыць ад бяссонніцы і дэпрэсіі, выводзяць таксіны і зніжаюць жар пры прастудзе. Яны дапамагаюць арганізму пераварваць цяжка засваяльную ежу з вялікай колькасцю тлушчу. Але ўсе гэтыя якасці раскрываюцца, толькі калі прыправы свежыя.

### ЯК НЕ КУПІЦЬ «НЕШТА НЕ ТОЕ»

Спецыі прыязджаюць у Беларусь з розных краін: Індыі, Кітая, Турцыі, В'етнама, Егіпта, Узбекістана, Грузіі... Іх выбар — справа сур'ёзная, бо яны лёгка ўбіраюць у сябе вільгаць і староннія пахі, губляюць карысныя і смакавыя ўласцівасці ад сутыкнення з паветрам. Нават у сябе на радзіме, не кажучы ўжо пра краіны, дзе многія стагоддзі ведалі толькі цыбулю і кроп, спецыі — выдатная глеба для фальсіфікацый. Напрыклад, молатыя спецыі робяць крыху больш вільготнымі — тады іх вага павышаецца (у шкоду смаку і паху). Бывае, у тую ці іншую прыправу дадаюць нейкія інгрэдыенты: напрыклад, у чырвоны молаты перац можа быць дададзена цагляная дробка, у гарчыцу — попел, у спецыі могуць дадавацца таксама мука, крухмал, молатая крэйда.

Здараецца, адны спецыі могуць выдаваць за іншыя, даражэйшыя. У нашых шыротах гэта нескладана — наўрад ці многія здольныя на вока адрозніць касію ад карыцы або ведаюць, як выглядае, скажам, струк ванілі. Такім чынам, калі вы не разбіраецеся ў прыправах прафесійна, застаецца спадзявацца толькі на давер да прадаўца.

Ёсць розныя спосабы выяўлення фальсіфікацый (напрыклад, дома апусціць дробку спецый у ваду: многія «дадаткі» выпадуць у асадак), але, вядома, больш эфектыўны лабараторны аналіз. І гэта — аргумент на карысць набыцця спецый у краме або на буйных рынках, дзе адміністрацыя клапоціцца аб рэпутацыі і сочыць за якасцю тавару.

### АБ ПЕРАВАГАХ ПАКУПНІКОЎ

Дарэчы, спецыі, затаўкі і прыправы — не адно і тое ж. Спецыі — гэта дабаўкі, якія надаюць страве пэўны смак (да іх кухары адносяць, напрыклад, соль, цукар і воцат). Затаўкамі (яны ж «пряности») называюць цэлыя або молатыя высушаныя расліны (гваздзік, базілік, лаўровы ліст, кмен). А заправы, або прыправы — гэта сумесь некалькіх кампанентаў.

Купляць на рынку кухары раяць менавіта затаўкі: набываць іх цалкам. Цэлыя высушаныя расліны або іх плады складана падрабіць. Акрамя таго, перцы гарошкам, цэлы гваздзік ці карыца лепш захоўваюць пах і смак, калі здрабніць іх дома ў кавамолцы. А вось наконт таго, каб змяшаць іх у заправы, — гэта можна зрабіць самастойна.

Беларускія пакупнікі аддаюць перавагу менавіта прыправам, растлумачылі на Камароўцы.

У ліку «бестселераў» — сумесі для мяса і фаршу, іх у дзень звычайна прадаецца аднолькавая колькасць. Самая папулярная заправа ў беларускіх гаспадынь — хмелі-сунелі, а ў апошнія гады нашы жанчыны рассмакавалі і сванскую соль.

А ў цэлым, з гадамі попыт мяняецца, гавораць прадаўцы.

Калі раней у першую чаргу раскупляліся чырвоны і чорны молаты перцы, лаўровы ліст, кмен, кроп і пятрушка, то сёння ўсё часцей пытаюцца пра маяран, імбір, арэгана, кардамон, мускатны арэх.

### ТЭОРЫЯ ВЫБАРУ

Вернемся да пытання, як выбіраць спецыі на рынку.

Якасныя спецыі абавязкова сухія — яны павінны лёгка рассыпацца пры дакрананні. І камячкоў у іх быць не павінна (калі ёсць, гэта кажа аб доўгім захоўванні і аб тым, што трапіла вільгаць). Да сумесяў спецый у выглядзе пасты, зразумела, гэта не адносіцца.

Пах той ці іншай спецыі павінен быць моцны і ўстойлівы.

Купляць іх трэба як духі: расцерці ў пальцах і адысці ад прылаўка, дзе занадта шмат пахаў. Цяпер панюхайце. Водар падабаецца? Значыць, можна набываць. Рэкамендуецца таксама пакаштаваць спецыю на кончык языка. Смак павінен быць прыемны і інтэнсіўны.

Вядома, лепш за ўсё даверцаць дакументам, якія сведчаць аб якасці і паходжанні тавару. Але ў рынкавай мітусні наўрад ці большасць пакупнікоў, акрамя самых скрупулёзных, будзе аб гэтых дакументах пытацца. Калі вы ўсё ж любіце паглыбляцца, то ведайце — не варта набываць прыправы, выробленыя больш за паўгода таму, яны з вялікай доляй верагоднасці будуць «выветранымі».

### З ЧЫМ ГЭТА ЯДУЦЬ?

- Размарын ідэальны для мясных страў — да гарачага са свініны, бараніны, трусяціны. У грэчаскай кухні сухімі лісцікамі размарыну запраўляюць мяса хатняй птушкі. У французскай — надаюць акцэнт курыным супам. Пры ўжыванні размарыну не варта выкарыстоўваць у якасці заправы лаўровы ліст.
- Маяран падыходзіць да соусаў і мясных страў, для хатняй тушонкі. Надасць непаўторны смак закаткам (агуркі, баклажаны, перац, кабачкі). Лепш за ўсё маяран спалучаецца з арэгана і чаборам.
- Каляндру ўжываюць пры засолцы агародніны і кансерваванні мяса, а таксама пры выпечцы хатняга хлеба.
- Карыцу ў молатым выглядзе варта дадаваць у цеста на этапе замешвання. У выглядзе кавалачкаў кары — у вадкія гарачыя стравы хвілін за пяць да гатоўнасці.
- Гваздзік пры доўгім награванні страчвае частку свайго водару, а яго пякучасць, наадварот, узмацняецца, таму дадаваць яго трэба незадоўга да гатоўнасці стравы.
- Папрыка не падыходзіць для смажаных страў — яна лёгка падгарае. Не спалучаецца з рэпчатай цыбуляй, а таксама з кінзой.
- Чорны молаты перац не дадаюць у стравы, якія трэба доўга гатаваць, — ён страціць смак і водар, застанецца толькі горыч. У стравы, якія гатуюцца даўжэй за некалькі хвілін, перац дадаюць гарошкам.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ

УНП 100071325

## Государственное производственное объединение «Минскстрой»

**доводит до сведения заинтересованных лиц информацию о внесении изменений в проектную декларацию (опубликована в газете «Звязда» от 12.12.2024 № 242 (30376) с изменениями от 13.12.2024 № 243 (30377), от 14.02.2025 № 31 (30419), от 25.03.2025 № 58 (30446), от 30.05.2025 № 103 (30491)) о строительстве жилых (нежилых) помещений и машино-мест в составе объекта строительства «Комплекс жилой застройки «Уютный». Группа многоквартирных многоэтажных жилых домов в районе улиц Подлесной – Парниковой – Дачного проезда»:**

– **жилые помещения** в составе объекта «Комплекс жилой застройки «Уютный». Группа многоквартирных многоэтажных жилых домов в районе улиц Подлесной – Парниковой – Дачного проезда». Вторая очередь строительства. Жилой дом № 1 по ГП (далее – жилой дом № 1);

– **машино-места, супермаркет** в составе объекта «Комплекс жилой застройки «Уютный». Группа многоквартирных многоэтажных жилых домов в районе улиц Подлесной – Парниковой – Дачного проезда». Вторая очередь строительства. Многоуровневая гараж-стоянка со встроенным супермаркетом № 3.2 по ГП (далее – гараж-стоянка № 3.2).

Планируемый срок завершения застройщиком строительства объектов и ввода в эксплуатацию в соответствии с проектной документацией: жилой дом № 1 – 26 апреля 2027 года; гараж-стоянка № 3.2 – 25 января 2026 года.

**Объект долевого строительства – жилое помещение (квартира); жилое помещение (квартира) с машино-местом; машино-место; супермаркет.**

Для категории граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, для заключения договоров создания объектов долевого строительства на дату опубликования настоящих изменений в декларацию по жилому дому № 1 предлагается **4 (четыре)** жилых помещения (квартиры) с учетом приобретения машино-места в гараже-стоянке № 3.2, в том числе:

- **4 (четыре) двухкомнатные квартиры:**
- № 35 (общая площадь 64,13 кв. м);
- № 91 (общая площадь 64,34 кв. м);
- № 154 (общая площадь 64,41 кв. м);
- № 383 (общая площадь 68,96 кв. м).

Количество реализуемых машино-мест к указанным двухкомнатным квартирам в гараже-стоянке № 3.2 по настоящим изменениям в проектную декларацию составляет 4, из них:

3 машино-места, находящихся на 4, 5 уровнях для жилых помещений (квартир) № 35, № 91, № 154 жилого дома № 1, опубликованных в настоящих изменениях;

1 машино-место, находящееся на 2-5 уровнях для жилого помещения (квартиры) № 383 жилого дома № 1, опубликованной в настоящих изменениях;

**Цены на объекты долевого строительства:**

Стоимость строительства 1 квадратного метра общей площади объектов долевого строительства без выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет:

| Номер квартиры | Подъезд | Этаж | Количество комнат | Площадь жилого помещения (квартиры), $м^2$ | Стоимость 1 $м^2$ при 100 % оплате, бел. рублей | Стоимость 1 $м^2$ при условии кредитования в рамках партнерских кредитных программ*, при оплате по графику платежей, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 35, 91, 154 | 1– 3 | 9 | 2 | 64,13–64,41 | 5 050,00 | 5 261,00 |
| 383 | 7 | 5 | 2 | 68,96 | 5 200,00 | 5 417,00 |

*Банками-партнерами являются ОАО «АСБ Беларусбанк», ОАО «Белинвестбанк».*

Стоимость 1 $м^2$ машино-места к указанным двухкомнатным квартирам, находящегося в составе гаража-стоянки № 3.2, при 100 % оплате – 2 600,00 бел. рублей.

Также для категории граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, для заключения договоров создания объектов долевого строительства на дату опубликования настоящих изменений в декларацию по жилому дому № 1 предлагаются **8 (восемь)** жилых помещений (квартир) без приобретения машино-места без изменения стоимости 1 квадратного метра общей площади, в том числе:

**2 (две) однокомнатные квартиры:**
- № 276 (общая площадь 45,5 кв. м);
- № 341 (общая площадь 46,51 кв. м);

**3 (три) двухкомнатные квартиры:**
- № 62 (общая площадь 66,02 кв. м);
- № 126 (общая площадь 65,97 кв. м);
- № 303 (общая площадь 63,8 кв. м);

**3 (три) трехкомнатные квартиры**:
- № 37 (общая площадь 87,05 кв. м);
- № 156 (общая площадь 86,93 кв. м);
- № 159 (общая площадь 81,24 кв. м).

Также для категории граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, для заключения договоров создания объектов долевого строительства на дату опубликования настоящих изменений в декларацию по гаражу-стоянке № 3.2 предлагается **8 (восемь)** машино-мест, находящихся на 2 уровне стоимостью 1 $м^2$ при 100 % оплате – 2 700,00 бел. рублей, в том числе:

- № 343, № 350, № 351 (общая площадь 12,5 кв. м каждое);
- № 362, № 364, № 366, № 368 (общая площадь 13,75 кв. м каждое);
- № 369 (общая площадь 14,3 кв. м).

**Условия оплаты для квартир остаются неизменными.**

**Условия оплаты для машино-мест, содержащихся в настоящем извещении:**

единовременная оплата машино-места в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме.

**Заявления** о заключении договоров будут приниматься (регистрироваться) со следующего дня после публикации настоящих изменений в проектную декларацию в порядке очереди по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105. Договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться после получения уведомления от ГПО «Минскстрой» (посредством телефонной связи, сообщения в Viber, Telegram), но не ранее 7 (семи) календарных дней после опубликования настоящих изменений по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105, с физическими и юридическими лицами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

ГПО «Минскстрой» имеет право отказать в заключении договора создания объекта долевого строительства без объяснения причин.

Условия декларации, не измененные (не исключенные) настоящим извещением, остаются неизмененными.

Подробные сведения об объекте строительства, планировках квартир и ходе строительства можно получить в отделе реализации объектов недвижимости и жилья по адресу: **г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105, тел. моб. +375 29 195 18 21,** либо на сайтах: **https://minskstroy.by, http://www.uyutnyi.by.**

АНОНС

# САКРЭТЫ ЖАНОЧАГА ШЧАСЦЯ, ЗДАРОЎЕ І МОДА

## Пра што раскажа «Алеся» ў жніўні?




### ВАЛЯНЦІНА МІХАСЕНКА: «КЛЮЧ ДА ШЧАСЦЯ ЁСЦЬ У КОЖНАГА»

Валянціна Міхасенка ўваходзіць у лік найбольш паспяховых прадпрымальнікаў сталіцы ў сферы малога бізнесу. Стваральніца аднаго з найстарэйшых сёння агенцтваў нерухомасці ў Беларусі расказала, як выстаяць у жыццёвых бурах і чаму за няўдачы варта дзякаваць лёсу.

— Ключы ад жаночага шчасця (і матэрыяльнага дастатку як аднаго з яго складнікаў) знаходзяцца ўнутры жанчыны, у яе душы і ладзе думак. І запаветныя дзверы адчыняюцца не вонкі, а ўнутр. Толькі калі становішся «шчаслівай і багатай» унутры, прыходзіш у гэты стан у сваёй душы, у навакольным свеце цябе знаходзяць і «прынц», і дастатак, — падзялілася сваім рэцэптам шчаслівага жыцця Валянціна Міхасенка.

### ГЕРАІНІ ВОГНЕННЫХ ГАДОЎ

Гартаючы архіўныя нумары часопіса, адчуваеш подых гісторыі. Бачыш, як мінаюць дзесяцігоддзі, радзеюць шэрагі тых, хто каваў Перамогу. Нашым папярэднікам — журналістам «Работніцы і сялянкі», а пазней «Алесі» — выпала ўнікальная магчымасць: сустракацца, размаўляць з легендарнымі жанчынамі-патрыёткамі, чые імёны ведала ўся краіна. Разам з імі адзначаць юбілеі вызвалення Беларусі ад фашызму. Карпатліва збіраць факты пра тых, хто не вярнуўся з вайны. Разам з «Алесяй» у межах праекта «Перамога ў нашых сэрцах» згадваем, пра што пісаў жаночы часопіс у гады юбілеяў з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

### ПСІХАЛОГІЯ, ЛЕТНЯЕ ХАРЧАВАННЕ, МОДНЫЯ ТРЭНДЫ

У жнівеньскім нумары чытайце таксама пра тое, ці варта ўлетку пераходзіць на харчаванне садавіной, што такое зайздрасць і як накіроўваць яе ў канструктыўнае рэчышча, якім жанчынам дастаецца сапраўдныя мужчыны і чаго ні ў якім разе нельга рабіць для свайго выбранніка. Часопіс распавядзе пра школьнае адзенне ў новым навучальным годзе, параіць, як сучасна і элегантна выглядаць жанчынам ва ўзросце 50+ і як адпавядаць у адзенні гарачым трэндам гэтай восені.

Заставайцеся з «Алесяй»! З намі цікава!

**Алена ВАЛЕР'ЕВА.**

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень


**АВЕН**. Тыдзень, падчас якога можаце часова страціць спакой. Не спяшайцеся адказваць «так» на кожнае пытанне. Ёсць рызыка, што ўім будзе нейкі тонка завуаліраваны падвох. Даўшы згоду на не да канца вывучаную ідэю, вы рызыкуеце трапіць у няёмкую сітуацыю. У заключны перыяд тыдня прыемныя эмоцыі прынясуць зносіны з дзецьмі або чатырохногімі гадаванцамі, прагляд папулярнага тэлепраекта.


**ЦЯЛЕЦ**. На першае месца выйдуць сяброўскія адносіны і клопаты сям'і. Паспрабуйце не забываць пра сябе. Узровень жыццёвых сіл хоць і высокі, аднак мае патрэбу ў рэгулярным падсілкоўванні. У канцы тыдня чакаецца цікавая прапанова. На выхадныя нічога загадзя не плануйце, паколькі планам, хутчэй за ўсё, не наканавана спраўдзіцца.


**БЛІЗНЯТЫ**. Тыдзень прынясе спрыяльныя перамены ў асабістых справах. Паспрабуйце не губляць ні адной каштоўнай хвіліны. Гараскоп рэкамендуе засяродзіцца на дробязях, з якіх складаецца побыт. У канцы перыяду прытрымлівайце азарт. Усё, што звязана з рызыкай, будзе гуляць супраць вас. Нацэльвайцеся на невялікія праекты, прааналізуйце тое, чаго дасягнулі, складзіце план на будучыню.


**РАК**. Ёсць шанц атрымаць выгаду там, дзе іншыя бачаць толькі непрыемнасці. Добра пройдуць любыя справы, нацэленыя на кароткатэрміновы поспех. Не трэба ўцякаць ад зносін. У ходзе адной з размоў можа праліцца святло на падзеі, якія адбываюцца, або будзе цікавая прапанова. У асабістых адносінах усё адназначна. Канец тыдня спрыяе пачатку дыеты і аздараўленчым мерапрыемствам.


**ЛЕЎ**. Вы можаце падвергнуцца своеасаблівай праверцы. Верагодна, выкрыюцца наступствы мінулых адносін, ці нагадае пра сябе калісьці дапушчаная халатнасць у якой-небудзь справе. Гараскоп рэкамендуе дзейнічаць па абставінах. Нельга мець усяго адзін строгі план, яго заўсёды можна скарэкціраваць. Не адмаўляйце таму, хто просіць руку дапамогі.


**ДЗЕВА**. Перыяд будзе напоўнены радасцю і гармоніяй. Не шукайце падвохаў. Вам неабходна паверыць у поспех і паспрабаваць атрымаць у гэты час максімум карысці. Добра будуць удавацца справы, звязаныя з рашэннем набалелых пытанняў. Зоркі раяць пераходзіць у наступленне па ўсіх сферах жыцця. Заставайцеся сабой, больш цвёрдасці ў дзеяннях і словах.


**ШАЛІ**. Астралагічнае становішча напоўніць жыццё прыемнымі падзеямі. Вы зможаце знайсці нетрывіяльнае рашэнне старой праблемы. Спрыяльныя абставіны дапамогуць настроіцца на пазітыў і ўпэўнена глядзець у будучыню. Натхнёны настрой не пакіне і адзінокіх прадстаўнікоў вашага знака задыяка. Можна спадзявацца на цікавае знаёмства, рост увагі з боку цікавых вам людзей.


**СКАРПІЁН**. Тыдзень будзе прыемным і спакойным. Вольны час рэкамендуецца накіраваць на ліквідацыю недагаворанасці ў асабістых справах. Больш такту ў зносінах — і вы ажыццявіце любое жаданне. У сярэдзіне перыяду можа з'явіцца апатыя і лянота. Нічога страшнага, цяпер можаце дазволіць сабе ператварыцца ў пухнатых кацянят, якія толькі і чакаюць, калі іх пяшчотна пагладзяць па поўсці.


**СТРАЛЕЦ**. Можаце смела ўкараняць інавацыі ў жыццё. Паспрабуйце сябе ў новых справах, асвойце новае хобі, паэксперыментуйце з прычоскай або пазбаўцеся ад непатрэбных рэчаў. У другой палове перыяду ўзрасце камунікатыўныя здольнасці. Вы зможаце навязаць свой пункт гледжання нават заўзятаму аматару спрэчак. Настрой будзе прыўзнятым, а энергетычны патэнцыял высокім.


**КАЗЯРОГ**. У пачатку тыдня можа здацца, што вы перасталі выклікаць цікавасць у іншых людзей. Верагодна, гэта так і ёсць, але перажываць не варта. Хутка вы зноў адновіце сваю папулярнасць. Гараскоп паказвае, што ў гэты перыяд можаце атрымаць адказ на важнае пытанне. У другой палове перыяду на першае месца выйдзе асабістае жыццё.


**ВАДАЛІЎ**. Вы адчуеце эфектыўнасць абранага курсу. Нават калі прыйдзецца адкарэкціраваць нейкі працэс, гэта не паўплывае на ваш поспех. Радасны настрой спрыяльна адаб'ецца на адносінах з блізкімі людзьмі. У сярэдзіне перыяду можа адбыцца значная сустрэча.


**РЫБЫ**. Энергіі будзе хоць пазычай, але ёсць рызыка накіраваць яе ў няправільнае рэчышча. Часцей райцеся з тымі, хто ведае толк у жыцці. Поспех любіць тых, хто не крычыць гучна пра сябе. Напрыканцы будзе карысна звесці да мінімуму любыя кантакты. Чытанне кніг і прагляд праграм прынясуць куды больш вялікую карысць. Не забараняйце сабе злёгку памарыць.

# Надвор'е на заўтра

| Горад | Ноччу | Днём |
|---|---|---|
| МІНСК, 755 мм рт.сл. | +8..+10°C | +12..+16°C |
| ВІЦЕБСК, 753 мм рт.сл. | + 8..+10°C | +13..+14°C |
| МАГІЛЁЎ, 755 мм рт.сл. | +9..+11°C | +14..+16°C |
| ГОМЕЛЬ, 756 мм рт.сл. | +11..+12°C | +15..+17°C |
| ГРОДНА, 757 мм рт.сл. | +8..+9°C | +12..+15°C |
| БРЭСТ, 759 мм рт.сл. | +9..+10°C | +15..+18°C |

Паводле даных Белгідрамета

**Месяц**

*Маладзік 23.08.–30.08. Месяц у сузор'і Дзевы.*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**




**...у суседзяў**

| | |
|---|---|
| МАСКВА | +18..+19°C |
| С.-ПЕЦЯРБУРГ | +16..+17°C |



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

**23 ЖНІЎНЯ** Даты | Падзеі | Людзі

У краіне

**1910** год — нарадзіўся Павел Мікалаевіч Рак, удзельнік вызвалення Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, на фронце з 1941 г. Камандзір узвода сярэдніх танкаў лейтэнант Рак вызначыўся 30 чэрвеня 1944 г. пры вызваленні г. Барысава: экіпаж танка пад камандаваннем Рака прарваўся ў заняты ворагам горад і 17 гадзін вёў бой. У Барысаве танкістам пастаўлены помнік.

**1920** год — Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Беларусі прыняў пастанову аб стварэнні Цэнтральнага статыстычнага бюро (з 1924 года Цэнтральнае статыстычнае ўпраўленне БССР). З 1994 — Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь, з 2008 — Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь.

У свеце

**1880** год — нарадзіўся Аляксандр Сцяпанавіч Грын (сапраўднае прозвішча Грынеўскі). Рускі савецкі пісьменнік, прадстаўнік неарамантызму, аўтар філасофска-псіхалагічных твораў з элементамі сімвалічнай фантастыкі. Менавіта ў гэтай краіне адбываюцца падзеі многіх яго твораў, у тым ліку самых вядомых: феерыі «Пунсовыя ветразі», раманаў «Тая, што бяжыць па хвалях», «Залаты ланцуг», «Бліскучы свет».

### ЗВЯЗДОЎЦАЎ СТАЛА БОЛЕЙ!



***Ад усёй душы віншуем калегу Аляксандру ГВОЗДЗЕВУ з нараджэннем сына!***

***Жадаем, каб хлопчык вырас сапраўдным мужчынам, стаў вашай апорай і гонарам вашага сэрца. Няхай сын расце здаровым і вясёлым, няхай у яго жыцці будзе шмат яркіх фарбаў і добрых сяброў.***

***А пакуль хай ночы праходзяць спакойна, дні радуюць пяшчотай і цёплымі ўсмешкамі любімага маляняці!***

***Звяздоўцы.***

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 461 Індэкс 63850. Зак. № 1783.

Нумар падпісаны ў 19.30 22 жніўня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12